*Дзядова А.С.*

# Спецкурс №1
# Фанетыка. Арфаэпія

**Заданне 1.** Спісваючы, справа пасля кожнага слова ўкажыце гукавое абазначэнне падкрэсленых літар.

**Узор:** Н*е* знойдуць — [*а* ]; кама*н*дзір — [*н ʹ* ]; ма*т*чына — [*ч*] .

Па*тс*дам — ; ру*к*зак — ; ме*с*ці — ; ра*з*жаваць — ; *с*ве*д*чыць — ; *с*хіліцца — ; *с*пілаваць — ; бавоўнаво*дс*тва — *с*ківаца — , ра*с*чарціць — ; кана*дс*кі — ; е*з*джу — ; бру*с*чатка — ; па*д* дзірваном — ; па*д*чапіць — ; ра*н*цье — ; *з*ме*н*лівы — ; *с*фера — ; *с*ве*д*ка — ; *з*жаўцелы — ; до*ждж* — ; до*ж*джык — ; па*ц*вельвацца —

**Заданне 2.** Якія спецыфічныя рысы беларускай фанетыкі адлюстраваны ў наступнай прыказцы: “Госць першы дзень – золата, другі – серабро, а трэці – медзь, хоць дадому едзь”? Выпішыце з прыказкі як мага больш слоў, якія ілюструюць гэтыя рысы.

**Заданне 3.** Назавіце радок, у якім ва ўсіх словах колькасць гукаў аднолькавая.

1) разжаліцца, нясвіжскі, на кладцы;
2) паказчык, у палатцы, ручнік;
3) лётчык, езджу, сшытак;
4) веснік, сэрца, вучышся;
5) дождж, дзень, вуліца.

**Заданне 4.** Прывядзіце прыклады, якія даказваюць, што літара *З* **(“зэ”)** можа абазначаць розныя гукі.

**Заданне 5.** Вызначце, якімі гукамі адрозніваюцца наступныя пары слоў.

Радон – раён, гуслі – яслі, ясень – вязень, сядзь – сад, рэдзька – рэдка, вёў – вол.

**Заданне 6.** Прааналізуйце гукавы склад праведзеных слоў і вызначце, якія з прыведзеных пар слоў маюць агульныя зычныя гукі. Адзначце гэтыя гукі.

Яма – май, счапіць – сыраежка, стол – год, елка – клён, пэндзаль – дзверы, канчатак – дождж, параход – абшлаг, сляза – скрозь.

**Заданне 7.** Прачытайце наступныя пары слоў, аб’яднаныя гістарычнай агульнасцю кораня: *опыт – вопыт, устрица – вустрыца, льготный – ільготны, ржаной – аржаны, она – яна.* Адкажыце, якія фанетычныя прычыны абумовілі фармальнае разыходжанне слоў у рускай і беларускай мовах.

**Заданне 8.** Беларускі мовазнавец Янка Станкевіч настойліва даводзіў, што “парадак літар беларускай кірыліцы павінен быць такі: О, А, Э, Б, Г, Ґ, Х, Д, Е, Ё, Я, ДЗ, ДЖ, З, Ж, І, Й, К, Л, М, Н, Ф, П, Р, С, Ш, Т, В, У, Ў, Ь, Ц, Ч, Ы, Ю”. Як Вы думаеце, чым можна растлумачыць незвычайны пачатак такога варыянту алфавіта: ***О, А, Э…***?

**Заданне 9**. Перакладзіце словы на беларускую мову, пастаўце націск. Адзначце разыходжанні ў акцэнталагічных нормах беларускай і рускай моў.

Крапива, ворота, волосы, одиннадцать, апрель, верба, маленький, обручи, воду, душу, стену, под гору, фарфор, четырнадцать, лопух, каталог, везти, нести, валенок, на ногу, поровну, на печи, дочка, босой, каменный.

**Заданне 10.** Прафесар амерыканскага ўніверсітэта пытаецца ў аднаго са студэнтаў:

*– Што, на Вашу думку, больш за ўсё перашкаджае правільнаму вымаўленню слоў нашай мовы?*

*– Без усякага сумнення, – гэта жуйка.*

А якія ўплывы перашкаджаюць правільнаму вымаўленню гукаў і слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове? Прывядзіце ўласныя прыклады.

*Дзядова А.С.*

## Спецкурс № 2
## Фанетыка.Арфаэпія

**Заданне 1.** Падкрэсліце словы, у якіх літары ***е, ё, я*** абазначаюць галосны гук і мяккасць папярэдняга зычнага.

Вясёлка, Янка, пад’ём, копія, з’ездзіць, цемрашал, жыццё, сняданак, шчаўе, маянэз, клёцкі, ежа, аб’ехаць, бліны, Праметэй.

**Заданне 2**. Адзначце словы затранскрыбіраваныя правільна.

| | |
|---|---|
| 1) перад хатай – [п’эрат-хатай] | 4) дэзінфармацыя – [дэсынфармацыйа] |
| 2) падлеткі – [патл’этк’і] | 5) кліент – [к’л’ійэнт] |
| 3) распісаць – [рас’п’ісац’] | 6) адцадзіць – [аццадз’іц’] |

**Заданне 3.** Укажыце правільныя сцвярджэнні.

У школьнай практыцы пры класіфікацыі зычных гукаў ўлічваюцц

| | |
|---|---|
| 1) спосаб утварэння; | 3) месца ўтварэння; |
| 2) удзел голасу і шуму; | 4) наяўнасць, адсутнасць палаталізацыі. |

**Заданне 4**. Спалучыце адпаведным чынам лічбы і літары.

| | |
|---|---|
| 1. Гук [***р***] | а) плаўны(я) |
| 2.Зычныя [***в***], [***в’***], [***ў***], [***л***], [***л’***], [***й***] | б) насавы(я) |
| 3. Гукі [***м***], [***м’***], [***н***], [***н’***] | в) дрыжачы(я) |
| 4. Гукі [ж], [ш], [дж], [ч] | г) губны(я) |
| 5. Гукі [з’], [б’], [к’], [г’], [х’] | д) мяккі(я) |
| 6. Гукі [б], [п], [м], [ф], [в], [ф’], [в’] | е) шыпячы(я) |

**Заданне 5.** Спачатку запішыце ў транскрыпцыі гукі, якія могуць знаходзіцца ў абсалютным канцы славянскіх слоў, затым гукі, якія на канцы слоў знаходзіцца не могуць.

[б], [б’], [ў], [в], [в’], [з], [з’], [с], [с’], [м], [м’], [л], [л’], [н], [н’], [п], [п’].

| | |
|---|---|
| Гукі, якія могуць знаходзіцца на канцы слоў: | [ ], [ ], [ ], [ ], [ ], [ ], [ ], [ ], [ ]. |
| Гукі, якія не могуць знаходзіцца на канцы слоў: | [ ], [ ], [ ], [ ], [ ], [ ], [ ], [ ]. |

**Заданне 6.** Устанавіце, якімі гукамі адрозніваюцца прыведзеныя пары слоў. Укажыце іх у квадратных дужках.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Рыс – рысь | [ ] – [ ] | мёд – медзь | [ ] – [ ] |
| ёлка – золка | [ ] – [ ] | круг – крук | [ ] – [ ] |
| гуж – гуз | [ ] – [ ] | званар – святар | [ ] – [ ] |

**Заданне 7.** Выпішыце ў табліцу прозвішчы (псеўданімы) пісьменнікаў, у якіх пры змене слова ў адзіночным ліку адбываецца чаргаванне канцавых зычных асновы. Укажыце, чаргаванне якіх гукаў адбываецца. Запішыце хоць адзін твор гэтага аўтара.

| № | Прозвішчы (псеўданімы) пісьменнікаў | Гукі, якія чаргуюцца | Творы |
|---|---|---|---|
| | | | |

Ф.Багушэвіч, Цётка, В.Зуёнак, І.Мележ, К.Камейша, С.Дзяргай, М.Танк, Д.Бічэль, Я.Янішчыц, З.Бядуля, М.Лынькоў, Я.Маўр.

**Заданне 8.** Запішыце, з якімі фанетычнымі працэсамі звязана з’яўленне наступных амафонаў?

Плод – плот, казка – каска, не чула – нячула, весці – везці.

**Заданне 9.** Вызначце і запішыце беларускія словаформы, прадстаўленыя ў фанетычнай транскрыпцыі.

[м’іл’йарт], [кл’аччатка], [рашшчап’іц’], [шатланцк’і], [папуаск’і], [калеск’і], [апсал’утысцк’і], [адйутанцк’і], [шп’ійанаш], [л’адз’аш], [паткашчык], [ц’в’эрц’]

**Заданне 10.** Падкрэсліце назоўнікі, якія можна скласці з гукаў [а], [б], [в], [г], [р], [о], [ы], [т], выкарыстоўваючы любыя камбінацыі гэтых гукаў.

Герой, горы, вораг, роў, Рыга, воры, раб, бор, Бог, багор, горб, горад, рот, торг, брыво, рог, вароты, грады.

*Дзядова А.С.*

# Спецкурс № 3
## Фанетыка.Арфаэпія

**Заданне 1.** Спішыце. Падкрэсліце літары, якія **не** адпавядаюць вымаўленню. Справа пасля кожнага слова ўкажыце гукавое абазначэнне падкрэсленых літар, як паказана вышэй ва ўзоры.

| *I варыянт* | *II варыянт* | *III варыянт* | *IV варыянт* |
|---|---|---|---|
| 1) лічба | 1) зрабіць | 1) педфак | 1) не каяцца |
| 2) шматбаковы | 2) двухбортны | 2) прыезджыя | 2) шыпячы |
| 3) трохгадовы | 3) дзвесце | 3) садаводства | 3) спецгандаль |
| 4) усміхаецца | 4) на грушцы | 4) разносчык | 4) з’езд |
| 5) пяцьдзесят | 5) не верыць | 5) лётчык | 5) лікбезу |

**Заданне 2.** Вызначце выпадкі асіміляцыі і вусна ахарактарызуйце іх.

Вечнасць, водпаведзь, раз’яснець, расхістацца, расчахліць, замазка, раўнаважкі, скуф’я́, смарагд, носьбіт, ад’езд, Дзвіна, хрэсьбіны, пераносчык.

**Заданне 3.** Вызначце, якія гукі ўваходзяць у склад наступных беларускіх словаформ. Калі набор гукаў (не колькасць!) супадае, пастаўце лічбу – (**1**), калі не супадае – лічбу (**2**).

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Жабка – шапка | | кавалеры – каралевы | | камін – камні | |
| цяпліца – пятліца | | смог – мозг | | апломб – пломба | |

**Заданне 4.** Устаўце ў прыказкі патрэбныя словы, якія з’яўляюцца назвамі частак маўленчага апарату. Вусна растлумачце сэнс прыказак.

1. Чужы кусок дзярэ … .2. … век па балоце скача і не гразне, ды яшчэ ў Кіеў у карчму давядзе. 3. … да Кіева давядзе. 4. У каго згуба, у таго граху поўна … . 5. Не вер … – палажы на … . 6. Сказанага слова да … не вернеш. 7. Казаў бы па-нямецку, дык … грэцкі.

**Заданне 5.** Запішыце патрэбныя словы, каб атрымаліся “гукавыя прапорцыі”

| | |
|---|---|
| дом : том = ________ : пашыць | забіраць : ____________ = зяць : сядзь |
| бок : док = пакт : _____________ | джаз : час = ____________ : сыходзіць |
| пара : кара = пот : ___________ | аддай : адтай = ззаду : _____________ |
| маса : мяса = ___________: вяду | грам : _______________ = борт : порт |

**Заданне 6**. Запішыце словы-прыклады гістарычных чаргаванняў наступных гукаў.

| Гукі | Прыклады |
|---|---|
| [э] – [і] | |
| [э] – [а] | |
| [о] – [ы] | |
| [э] – [о] | |

**Заданне 7**. Прыгадайце тры пары слоў, якія адрозніваліся б толькі канцавымі цвёрдымі і мяккімі гукамі. Складзіце з гэтымі словамі сказы. Запішыце.

**Узор:** *Вучань атрымаў на экзамене высокі бал. Вечарам Аліну запрасілі на баль выпускнікоў.*

**Заданне 8.** Запішыце імёны і прозвішчы пяці беларускіх дзеячаў эпохі Адраджэння. У складзе кожнага імені і прозвішча павінен быць хаця б адзін санорны гук. Падрыхтуйце вуснае апавяданне пра значэнне дзейнасці кожнай асобы.

**Заданне 9.** Запішыце аднакаранёвыя словы, якія б пацвярджалі наяўнасць указаных чаргаванняў гукаў у корані.

[з’] – [ж] [з] – [с’]
[п’] – [пл’] [т] – [д]
[в] – [ў] [ч] – [ц]
[о] – [а] [э] – [і]

**Заданне 10.** Знайдзіце словы, няправільна падзеленыя на фанетычныя склады. Падзяліце іх правільна.

1) по-е-здам; 2) па-свіць; 3) пры-сут-ны; 4) лі-стоў-ка; 5) скуль-пту-ра; 6) кась-ба; 7) рэ-да-кцы-я; 8) ак-та-ва; 9) ге-рой-скі; 10) на-строй-вац-ца.

*Дзядова А.С.*

# Спецкурс №4
# Лексікалогія

**Заданне 1.** Амонімамі **(1)** ці мнагазначнымі словамі **(2)** з’яўляюцца пары выдзеленых слоў у словазлучэннях. Пастаўце адпаведную лічбу.

| Пары слоў | Пары слоў |
|---|---|
| 1) ***пралёт*** самалётаў – ***пралёт*** вуліцы | 4) адзенне з ***байкі*** – ***байкі*** Кандрата Крапівы |
| 2) пчаліныя ***соты*** – ***соты*** ў чарзе | 5) ***падатлівы*** характар – ***падатлівы*** метал |
| 3) ***кіслы*** яблык – ***кіслы*** настрой | 6) кукурузны ***пачатак*** – ***пачатак*** года |

**Заданне 2.** Упішыце кожную пару слоў у адпаведны слупок табліцы.

*Абкапаць – абкапаць, вялікі – велічэзны, грубка – групка, звычайны – звычаёвы, знаць – знаць, козка – коска, круціцца – кружыцца, начынка – начынне, піла – піла, прыклад – прыклад.*

| | |
|---|---|
| **Сінонімы** | |
| **Паронімы** | |
| **Амографы** | |
| **Амафоны** | |
| **Амаформы** | |

**Заданне 3.** Размяжуйце *архаізмы* і *гістарызмы*. Да архаізмаў прывядзіце сучасныя адпаведнікі:

Атрамант, веча, вярста, іспыты, ланіты, паморак, радца, рондаль, станавы прыстаў, ятвягі.

| | |
|---|---|
| **Архаізмы** | |
| **Сінонімы да архаізмаў** | |
| **Гістарызмы** | |

**Заданне 4.** Растлумачце лексічнае значэнне наступных слоў, якія характарызуюць этнакультурныя адметнасці побыту беларускага народа.

Абшыванка, выцінанка, вышыванка, вячоркі, грачанік, жур, зэдлік, кляновік, медавуха, талака.

**Заданне 5.** Раскрыйце сакрэт “прыгатавання” страў, названых Янкам Купалам у вершы *“Гутарка аб кепскім гаспадару”*: Груца ды зацірка, / Цэд, цура, кісель, / Мілта, саладуха – / Амаль стравы ўсе.

| Назва стравы | Характар стравы |
|---|---|
| *Груца:* | |
| *Зацірка:* | |
| *Цэд:* | |
| *Цура:* | |
| *Кісель:* | |
| *Мілта:* | |
| *Саладуха:* | |

**Заданне 6.** Прачытайце сказы. Замест тлумачэння слоў, што пададзена ў дужках, запішыце ў пачатковай форме словы, якія адпавядаюць прыведзеным значэнням.

1. Над зацягнутым (1. *зялёнай паверхняй з водарасцей, якой пакрываецца застаялая вада*) і (2. *жабінай ікрой*) берагам сажалкі да самай вады схіліліся старыя дуплаватыя вербы. Да самых местачковых хат падышла паводка, заліла (3. *лугі ў пойме ракі*) і грады, двары і нізкія вуліцы, (4. *месцы каля вёскі, дзе пасецца жывёла, птушка*) і зарэчныя лугі, далёкія (5. *наносныя пясчаныя пагоркі*), затапіла астравы, лазнякі і алешнікі, далёкія дубы па самую макаўку стаяць у вадзе (С. Грахоўскі).

1 –…;  2 –…;  3 –…;  4 –…  ; 5 –….

**Заданне 7.** Да апісальных назваў пэўных паняццяў, прадметаў, з'яў, працэсаў, дзеянняў ці таго, што складае рэаліі навакольнага свету ў рускай мове, запішыце аднаслоўныя беларускія адпаведнікі.

| Руская мова | Беларуская мова |
|---|---|
| Жгучая крапива | |
| Место, где стоял или стоит з**а**мок | |
| Впасть в детство, вести себя подобно ребёнку | |
| Теплые страны, куда летят зимовать пералётные птицы | |
| Возвышенный участок леса в бору | |

**Заданне 8.** Запішыце, якія беларускія назвы месяцаў адпавядаюць паняццям, аформленым з дапамогай слоў, дадзеных ніжэй. Растлумачце, якім чынам у семантыцы прыведзеных лексічных адзінак адлюстравалася матэрыяльная і духоўная культура беларусаў?

Агароднік – …; бліннік – …; бярозавік – …; вясельнік – …;  вясеннік – …; мёднік – …; мясаед – …; поснік – …; спаснік – …; хлебнік – …;  шчаўнік – …; ягаднік – … .

**Заданне 9.** У "Беларускай граматыцы для школ"Б. Тарашкевіча (1918 г.) сустракаюцца наступныя лінгвістычныя тэрміны: *зложныя словы, клічнае слова, недаказ, неазначальнік, прадлог, прадметнік, пункт, чужаслоў.* Падбярыце да кожнага з іх адпаведнік з сучаснай лінгвістычнай тэрміналогіі. Якія з тэрмінаў, выпрацаваных Б. Тарашкевічам, захаваліся і сёння?

**Заданне 10.** Устанавіце адпаведнасць паміж тэрмінамі, якія прапаноўваліся ў 20-я гг., і іх сучаснымі варыянтамі. Адказ запішыце ў форме літарна-лічбавага спалучэння.

| Тэрмін 20-х гадоў XX ст. | Сучасны адпаведнік тэрміна |
|---|---|
| **А.** зельнік | **1.** гібрыд |
| **Б.** мяшанец | **2.** паразіт |
| **В.** прысваенне | **3.** гербарый |
| **Г.** чужаед | **4.** інтэрмедыя, інтэрлюдыя |
| **Д.** паміждзея | **5.** гармонія |
| **Е.** суладжванне | **6.** асіміляцыя |

Дзядова А.С.

# Спецкурс № 5
# Фразеалогія. Парэміялогія

**Заданне 1.** Запішыце фразеалагізмы, крыніцай паходжання якіх з'яўляюцца наступныя старажытнагрэчаскія міфы.

1. Міф аб Арыядне. 2. Міф аб Тантале. 3. Міф аб Ахілесе. 4.Міф аб Сізіфе. 5. Міф аб Гордзіі. 6. Міф аб Дамокле. 7. Міф аб Праметэі. 8. Міф аб Семірамідзе.

**Заданне 2.** Падбярыце да беларускіх фразеалагізмаў адпаведнікі з рускай мовы.

1. Не святыя гаршкі лепяць. 2. З дуба вецце збіраць.3. Зямля нанаедная (ненаежная). 4. Гады ў рады. 5. Скрывіцца як серада на пятніцу. 6. Асёл маляваны (варона загуменная).7. Грушы на вярбе.

8. Хоць гаць гаці. 9. Пустая галава не сівее. 10. Не па кату сала (не па сабаку костка).

**Заданне 3.** Устаўце ў фразеалагізмы прапушчаныя словы-кампаненты.

Біцца ... аб лёд, бачыць на тры сажні ..., крукам ... не дастаць, снег …тушыць, зімою ... пашкадуе, хапаць ... з неба, малако ... не абсохла, у ... рог скруціць, зубы класці ..., адчыніць ... у іншы свет, за словам ... не лезе, мароз ... па скуры, іскры ... з воч, альфа і ..., хоць ваўкоў ... , як гром з ... неба, чорт нагу ..., зуб на зуб ..., хоць кол ... чашы, як гара ... звалілася.

**Заданне 4.** Замяніце словы і словазлучэнні фразеалагізмамі, якія рэпрэзентуюць псіхічную і фізічную дзейнасць чалавека.

1) Займацца балбатнёй, пустасловіць; 2) смяяцца; 3) баяцца, палохацца; 4) плакаць; 5) драмаць.

**Заданне 5.** Падбярыце да наступных словазлучэнняў фразеалагізмы-антонімы.

Душу ў душу; як рукой падаць; нага за нагу; куры не клююць; пайсці на свой хлеб; з года ў год; не пакладаючы рук; хоць вока выкалі.

**Заданне 6.** Растлумачце значэнні фразеалагізмаў, падбярыце да рускіх фразеалагізмаў адпаведнікі з беларускай мовы.

Видно птицу по полету; нести ахинею; сбить с толку; беречь как зеницу ока; дать жару; в час по чайной ложке; из уст в уста; один лучше другого; язык проглотить; чтоб не сглазить; удариться в амбицию.

**Заданне 7.** Дакажыце, што кожная з прыведзеных парэміялагічных адзінак пэўным чынам адлюстроўвае традыцыйную народную культуру Беларусі.

*1.Не адзін Гаўрыла ў Полацку. 2. І за Гомлем людзі ёсць. 3. Падраўся андарак – абыдуся і так. 4. Наш Васіль на работу не сіл, а на клёцкі ў малацэ – за чацвярых валачэ. 5. Калядкі – добрыя сняткі: наеўся, напіўся ды й на палаткі. 6. На Яна баба п'яна, а на Пятро – у жыце ядро. 7. Калі няма капусты, дык у жываце пуста. 8. Антось ды Тадора – што лапаць і абора. 9. Круці жорны пільна, то й дома будзе Вільня. 10. Якія мы гаспадары, такія нашыя двары.*

**Заданне 8.** Сярод наступных прыказак і прымавак знайдзіце і выпішыце тыя, структурныя кампаненты якіх маюць нацыянальна-культурны кампанент значэння.

*1. Ведае кошка, чыё сала з'ела. 2. Еж капусту з грыбамі, а язык трымай за зубамі. 3.Ніхто не чуе, як удава кукуе. 4. Не судзіце, ды не судзімы будзеце. 5. Не такі чорт страшны, як яго малююць. 6. Паспееш з козамі на торг. 7. Калі курэц, то насі люльку і тытунец. 8. Пасля бойкі кулакамі не махаюць. 9. Языком у Вільні, а розумам за печчу. 10. Прыйшлі Пакровы – заганяй у хлеў каровы.*

**Заданне 9.** Растлумачце сэнс наступных прыказак і прымавак.

1. Хто парасё ўкраў, таму ўвушшу пішчыць.

2. Золата і ў попеле свеціцца.
3. Стары вол баразны не псуе.
4. Чалавек думае, а Бог робіць.
5. Слоў – на мех, а работы – на смех.
6. Сцеражонага Бог сцеражэ.
7. У каровы малако на языку.
8. У ціхім балоце чэрці водзяцца.
9. З незабітага ліса футра не шыюць.
10. Пераначуем – болей пачуем.

**Заданне 10.** Назавіце прыказкі, якія перадаюць змест прыведзеных па-беларуску.

1. У баязліўца ад цені дрыжаць калені (малд.).
2. Без працы пернікаў не купіш (укр.).
3. Калі грому многа – дажджу мала (казах.).
4. Голаму сарочка сніцца (франц.).
5. Ціхая вада берагі рве (польск.).
6. З аднаго каменя мур не паставіш (балг.).
7. Халат найлепшы новы, а сябар найлепшы стары (турк.).
8. Мели, Емеля,твоя неделя (рус).

*Дзядова А.С.*

# Спецкурс № 6
# Фразеалогія. Парэміялогія

**Заданне 1.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі рускай і беларускай моў. Адказ запішыце ў форме літарна-лічбавага спалучэння.

| Руская мова | Беларуская мова |
|---|---|
| **А.** По труду и честь | **1.** *Ад ляноты чакай бядоты* |
| **Б.** Задаваць тон | **2.** *Будзе на лета, але не на гэта* |
| **В.** Труд человека кормит, а лень портит | **3.** *Якая справа, такая і слава* |
| **Г.** Улита едет – когда то будет | **4.** *Яму гавары, а ён дагары* |
| **Д.** Я про Фому, а он про Ерему | **5.** *Рэй весці* |
| **Літарна-лічбавая адпаведнасць:** | |

**Заданне 2.** Сярод прыведзеных фразеалагізмаў, якія характарызуюць чалавека ў пэўных адносінах, знайдзіце і выпішыце тыя, якія маюць адмоўную канатацыю. Растлумачце іх значэнне. У якіх фразеалагізмах структурныя кампаненты маюць нацыянальна-культурную семантыку?

Драць горла, залівацца салаўём, жвір у вочы сыпаць, выйсці ў людзі, біць у хамут, цаны няма, мякіна ў галаве, брэша як лён чэша, гнуць спіну, гарыць у руках, як мыла з'еўшы, гаворыць як крыніца булькоча, выносіць смецце з хаты, рабіць душы паслухаўшы, малоць не падсяваючы, чортам падшыты.

**Заданне 3.** Выпішыце фразеалагізмы,

1) аб'яднаныя значэннем **'прыслугоўваць, дагаджаць, ліслівіць'**

Біць у званы, у пер'е ўбрацца, лістам слацца, ісці рукой, хадзіць на задніх лапках, віляць хвастом, акунёў вудзіць, глядзець у рот,падпусціць лёстачак, вады не замуціць, пець лазара, свяціць вачыма, строіць кепікі, насіць на руках;

2) аб'яднаныя значэннем **'хлусіць, падманваць, ашукваць'**

Ліса фарбаваць, вадзіць за нос, з ветру вяроўкі віць, казу лабатую плесці, язык як мянташка, пра жураўля на хвойцы расказваць, сабак ганяць, слязьмі абліваецца, смаловы дуб плесці, снег саломаю тушыць, пудрыць мазгі.

Хто з беларускіх мовазнаўцаў вывучаў (вывучае) устойлівыя адзінкі мовы?

**Заданне 4.** У кожным слупку знайдзіце лішні фразеалагізм. Растлумачце, чаму ён лішні.

| | |
|---|---|
| *1. За вушы не адцягнеш;*<br>*пальчыкі абліжаш;*<br>*расце ў роце;*<br>*у роце растае* | *2. Курам на смех;*<br>*не лезе ні ў якія вароты;*<br>*нікуды не варты;*<br>*як курыца лапай* |
| *Даць жару;*<br>*даваць стракача;*<br>*здымаць стружку;*<br>*намыліць шыю* | *4. Адным скокам;*<br>*на адной назе;*<br>*на шырокую нагу;*<br>*як на пажар* |

**Заданне 5.** Запоўніце табліцу, аднавіўшы адносіны паміж фразеалагізмамі і іх значэннем.

| Фразеалагічны адпаведнік | Значэнне фразеалагічнай адзінкі |
|---|---|
| | *драмаць седзячы* |
| Калі з роду баравік, то лезь, браце, у кошык. | |
| | *вельмі даўно* |
| Ні села ні пала | |
| | *невядома калі; ніколі* |

**Заданне 6.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннем.
Узор запісу: А 1; Б 5; В 6…

| | |
|---|---|
| **А .** *Вуды закідваць* | **1.** *Вельмі даўно* |
| **Б .** *Даставаць гізунты* | **2.** *Вельмі мала* |
| **В .** *За дзедам шведам* | **3.** *Вельмі прыгожы* |
| **Г .** *Рукой пайсці* | **4.** *Рабіць намёк на што-небудзь* |
| **Д .** *Як Піліп з канапель* | **5.** *Здзіўлена, разгублена* |
| **Е .** *Выкручваць сыры□цу* | **6.** *Нечакана, знянацку* |
| **Ё.** *Напрамілы бог* | **7.** *Вельмі шчыра і настойліва* |
| **Ж .** *З жабіны прыгаршчы* | **8.** *Моцна здзекавацца* |
| **З .** *Хоць вады напіся* | **9.** *Добра весціся, гадавацца (пра жывёл, птушак)* |
| **І .** *Як гусь на бліскавіцу* | **10.** *Муштраваць, цалкам падпарадкоўваць сваёй волі* |
| | **11.** *Павольна, не спяшаючыся* |
| | **12.** *Лавіць рыбу* |

**Заданне 7.** Аднавіце прыказкі, замяніўшы адну з яе частак на дакладны адпаведнік.

1. Бачыць вока, ды не штодня –
2. Каб рыбу есці, трэба ёй пакланіцца –
3. Чужое не тучыць, бо і хлеб з’ядуць і торбу ўкрадуць –
4. Вясна кветкамі багата, а ён мне пра гарбузы –
5. Каб ведаў, дзе яма, то залатога б каня меў –

**Заданне 8.** Устаўце ў прыказкі патрэбныя словы, якія з’яўляюцца назвамі частак маўленчага апарату. Растлумачце сэнс прыказак.

1. За чужой шчакой … не баліць. 2. Знаеш ты толькі, што з … ў … . 3. Сказанага слова да … не вернеш. 4. Еш капусту з грыбамі, а … трымай за зубамі. 5. … шырокае, ды кішка тонкая.

**Заданне 9.** Некалі М. А. Янкоўскі слушна заўважыў: “Беларускія прыказкі – гэта музеі, дзе можна знайсці ўсё, што звязана з жыццём беларускага народа”. Прывядзіце прыклады прыказак, у структуру якіх уваходзяць побытавыя назвы (назвы страў беларускай нацыянальнай кухні, адзення, прылад працы, пабудоў, найменіі рэлігійных свят і інш.).

**Заданне 10.** Як вядома, у прыказках не сустракаюцца такія “гучныя” словы і іх спалучэнні, як *патрыятызм, адданасць Радзіме* і інш. Прывядзіце прыклады трапных народных выслоўяў, у якіх раскрываецца патрыятычнае пачуццё, вернасць чалавека роднай зямлі і любоў да яе. Якія структурныя кампаненты прыведзеных трапных народных выслоўяў маюць нацыянальна-культурнае ці сімвалічнае значэнне?

*Дзядова А.С.*

## Спецкурс №7
## Арфаграфія

**Заданне 1.** Запішыце, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і падкрэсліваючы іх. Вусна растлумачце правапіс.

Лат..рэя, в..семсот, Юпіт..р, фарват..р [’водны шлях для бяспечнага плавання суднаў, вызначаны сігнальнымі знакамі. // *перан.* Асноўная лінія, кірунак дзейнасці (ад ням. *varen* — плавацьі *water* — вада’)], д..баркад..р (’плывучая прыстань для рачных суднаў’), галант..рэя, крэч(э,а)т (’буйна́я драпежная птушка сямейства сакаліных’), ж..тон, (я,е)вангелле, карц(э,а)р, Оксф..рд, крат..р, міст..р, тост..р, ястр..б, (е,я)стр..бок, інт..л..генцыя, ж..стыкуляцыя, усм..хацца, ц..гліна, зел..нь, д..фект, др..васек, грэб..нь, (е,я)зыкаты, гл..таць, ш..дэўр, гор..ч, ш..раваты, ш..сцьдз..ся□т, др..мота, л..снікі, ц..гнікі, роўн..дзь, бо..зь, д(ы,э)л(я,е)гат, Свіц..зь, (е,я)давіты, м..нтуз, м..нтузок, с..мнаццаты, выгл..д, трохм..тровы, б..(з,с)концы, П..ц..рбург, Г..ракл, (Е,Я)раслаўна, П..труся Броўкі, Ав..р’ян, ч..рвонец, р..п..тыцыя, ч..снок, вас..мнаццаць, дз..вяты, дз..сятка, прыгр..ваць, шніц..ль, ц..р..моніцца, Од..р, ал..горыя, бр..зент, с..кунда, ве(е,я)лка, агр..гат, выстр..л, р..ўнаваць, се..лка, в’..тнамец, ч..хол, выкр..сліць, пр..йскурант, габ..лен, (а,э)л..ватар, р(а,э)з(я,е)да, выпр..гчы, прыв..ле(е,я)ваны, ж..ньшэнь, квец..нь, прыц..мкі, др..зіна, План..тарый, р..дыска, вы́р..заць, ч..рэшня, магн..тызм, прым(я,е)сь, др..жаць, майст..р, ц..лафан, ч..мадан, ст..рыл..зацыя, с..мсот, менедж..р, с..крэт, імпр..сары(а,о), адр..сат, гр..мучы, ц..гавіты, жоўц..нькі, с..льд..рэй, пр..амбула, бу(г,х)галт..р, экз..мпляр, р..сора, світ..р.

**Заданне 2.** Выпішыце **па парадку нумары** слоў, у якіх дапушчаны памылкі.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1) сэрцавіна | 11) галерэя | 21) радкаваты | 31) лямантаваць |
| 2) дрывасек | 12) апякун | 22) рэдкаслойны | 32) месячны |
| 3) лаўрыят | 13) анекдот | 23) лесніčоўка | 33) абеліск |
| 4) цвясці | 14) шэравокі | 24) мядзведзяня | 34) двухмятровы |
| 5) зацвятаць | 15) шэраваты | 25) легенда | 35) Бялград |
| 6) генеалогія | 16) рэпетыцыя | 26) сувязь | 36) камп’ютэр |
| 7) удалячынь | 17) адажыо | 27) мяккаваты | 37) ясакар |
| 8) удалячыні | 18) жоўценькі | 28) святкаванне | 38) цалюткі |
| 9) дробязь | 19) аператар | 29) цяжкаваты | 39) летуценне |
| 10) за́мяць | 20) рэферэндум | 30) ячмень | 40) Пятруся□ |

**Заданне 3.** Пад лічбай ① выпішыце **па парадку нумары** слоў, у якіх на месцы кропак трэба пісаць ***а***. Пад лічбай ② выпішыце нумары слоў, у якіх трэба пісаць ***я***.

1) н..жыццяздольны, 2) д..ўгачаканы, 3) н..д..бразычлівы, 4) жыцц..сцвярджальны, 5) жыцц..радасны, 6) р..знагалосы, 7) д..браякасны, 8) чырв..нашчокі, 9) др..бналессе, 10) мн..гавугольнік, 11) м..вазнаўчы, 12) н..ванароджаны, 13) шыр..каплечы, 14) п..ўнапраўны, 15) п..ўнаметражны, 16) зб..жжасховішча, 17) мар..заўстойлівы, 18) ільн..завод, 19) зерн..сушылка, 20) л..гкапаранены, 21) насенн..водства, 22) пол..ахоўны,

23) в..далячэбніца, 24) зме..падобны, 25) в..ўнапрадзенне, 26) земл..знаўства, 27) н..д..ўгавечны, 28) Сярэдн..вечча, 29) сярэдн..вяковы, 30) ч..рнабароды.

**Заданне 4.** Спішыце, раскрываючы дужкі. Падкрэсліце ў кожным слове літару пасля прыстаўкі. Вусна растлумачце правапіс ***і, ы, й.***

За(імець), па(імчацца), пры(імальны), адна(іменны), аб(ідуцца), па(іменна), за(іскрыцца), спад(ілба), ад(імжэць), пера(іменаваць), ад(ісці), звыш(інтэлігентны), аб(ішоў), ад(іду), па(іграць), над(ідзе), пад(ісці), раз(ісці)ся, да(іграць), (дэз)інфармацыя, пры(іду), с(ідзе), контр(ігра), пан(ісламізм), за(ікацца), пера(імаць), пост(інфарктны).

**Заданне 5.** Спішыце, устаўляючы замест кропак літары ***у*** або ***ў.*** Падкрэсліце іх, вусна растлумачце правапіс .

На ..рал, а..дыторыя, кантрольна-..ліковы, воін-..збек, дыназа..р, радаснае ”..ра”, мане..р, двое..ладдзе, ва ..ніверсітэце, з’ява ..нікальная, п’еса ”Тутэйшыя” ..першыню надрукавана, натары..с, а..дыторыя, бра..нінг, пра ..ніверсальнасць, За..ралле, ра..нд, кло..н, нака..т, лака..т, ра..т, шэдэ..р, шлагба..м, стра..с, га..птвахта, да..н, но..-ха..

**Заданне 6.** Перакладзіце на беларускую мову, падкрэсліце іншамоўныя спалучэнні галосных. Вусна растлумачце іх правапіс.

Мемориал, стереотип, хореография, шампиньон, йодистый, виолончель, абитуриент, фейерверк, ажиотаж, ион, майор, фойе, конвейер, бастион, ориентация, аксиома, миллион, профессионал, марионетка, педиатр, авиатор, миллиард, океан, реализм, чемпион, чемпионат, энтузиазм, приоритет.

**Заданне 7.** Выпішыце **па парадку нумары** слоў, у якіх на месцы кропак трэба пісаць **мяккі знак**.

1) раз..бяр, 2) сляз..мі, 3) мен..шы, 4) ін..шы, 5) кін..шчык (разм.), 6) дз..мухавец, 7) шчас..лівы, 8) Об..ю, 9) В..етнам, 1 0) увас..мярых, 11) кап..ё, 12) зац..менне, 13) з..мен..шыць, 14) кагос..ці, 15) свежас..ці, 16) любан..скі, 17) п..яўка, 18) астрахан..скі, 19) насып..це, 20) Сібір..ю, 21) звес..ся, 22) збуц..велы, 23) ц..віль, 24) ц..віцен..не, 25) грудз..мі, 26) соцен..ка, 27) пагалоў..е, 28) ц..мяны, 29) ледз..ве, 30) раз..юшаны, 31) кан..юнктывіт, 32) апен..кі, 33) падмен..ваць, 34) праваслаў..е, 35) прэм..ера, 36) выходз..ма, 37) пяцібор..е, 38) нян..чыцца, 39) малац..біт, 40) сем..дзесят, 41) чамадан..чык, 42) мен..шынство, 43) піс..меннасць, 44) нос..біт, 45) фантан..чык, 46) ранц..е, 47) сен..ёр, 48) бракан..ер.

**Заданне 8.** Выпішыце **па парадку нумары** слоў, у якіх ёсць *фанетычнае падаўжэнне* зычнага. Нумары слоў *з марфалагічным падваеннем* зычнага на стыку марфем **не выпісвайце.**

1) бя..со..ніца, 2) прагра..ма, 3) Пале..се, 4) ажы..цяўляць, 5) ма..са, 6) рэжы..сёр, 7) гу..лівы, 8) Сібір..ю, 9) каме..ны, 10) кало..ны (прым.), 11) бя..спрэчна, 12) бя..сэнсіца, 13) прэ..са, 14) ка..ліграфічны, 15) гру..па, 16) а..тэстат, 17) ба..лада, 18) водгу..ле, 19) мя..кі, 20) прадчува..не, 21) па..данства, 22) надзё..ны, 23) разво..дзе, 24) се..сія, 25) ра..злава..ца.

**Заданне 9.** Спішыце, устаўляючы замест кропак, дзе трэба, прыстаўны (устаўны) галосны ці зычны. Вусна растлумачце правапіс слоў.

За..орваць, пры..мчацца, на..одшыбе, вока..мгненна, ..мгненны, ..ольхі, ..мгла, ..асьміног, на..огул, у..огуле, ..мжысты, на..астрыць, ..окіс, ..одбліск, на..окал, ..этакі, за ..льнамялкай, пад ..льноцэрабілку, ..мшарына, на ..льготы, бачыў ..львяня, ..оптам, за ..ржаным полем, серп ..ржавы, вол ..рвануўся, па..мкнуцца, ..оспа, на..обмацак, На..ум, Тадэ..уш, ..Омск.

**Заданне 10.** Спішыце, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы патрэбныя літары. Вусна растлумачце правапіс вялікай або малой літары.

У (д,Д)зень (н,Н)астаўніка, (д,Д)авыд-(г,Г)арадок, (э,Э)поха (а,А)драджэння, (з,З)аходняя (Я,Е)ўропа, (м,М)лечны (ш,Ш)лях, (в,В)ялікая (м,М)ядзведзіца, (п,П)(я,е)трусёва дачка, (к,К)рапівоўская творчая манера, (п,П)аўночны (к,К)аўказ, (п,П)ола(т,ч)чына, (н,Н)асовічаў слоўнік, (д,Д)амоклаў меч, гінулі за (б,Б)ацькаўшчыну, (к,К)оласаўская стыпендыя, (ш,Ш)амякінскі стыль, (б,Б)рылёўскія мін(еа,ія)цюры, (б,Б)агдановічавы вершы, (н,Н)апал(ео,іё)наўская тактыка, (н,Н)обелеўская прэмія, (с,С)карынаўскія чытанні, (а,А)хілесава пята, (с,С)таршыня (п,П)рэзіды(у,ў)ма (в,В)ярхоўнага (с,С)авета (р,Р)эспублікі Беларусь, (м,М)іністэрства (а,А)дукацыі і (н,Н)авукі (р,Р)эспублікі Беларусь, (л,Л)юбл(е,і)нская (у,У)нія, (в,В)ялікая (а,А)йчы(н,нн)ая (в,В)айна, вёска (к,К)нязева (с,С)яло, выдавецтва ”(н,Н)ародная (а,А)света”, (у,У)станова (а,А)дукацыі ”Віцебскі (д,Д)зяржаўны (ў,У)ніверсітэт (і,І)мя П.М.Машэрава”, (б,Б)лізкі (ў,У)сход, (м,М)інскія вуліцы, (п,П)арыжская (к,К)амуна, заключылі (б,Б)рэсцкі (м,М)ір, свята ў (д,Д)оме (л,Л)ітаратараў, (н,Н)ародны (п,П)аэт, прыедзем на (в,В)ялікдзень, г.(в,В)ялікія (л,Л)укі, (к,К)андыдат (ф,Ф)ілалагічных навук, (с,С)аюз (п,П)ісьменнікаў, (а,А)кадэмія мастацтваў, (г,Г)анаровая (г,Г)рамата, сучасныя (з,З)ёлкіны і (г,Г)арлахвацкія, (ц,Ц)юменская нафта, (п,П)алескія раўніны, (р,Р)ыжскія завулкі, (т,Т)аварыства (б,Б)еларускай мовы, (т,Т)ураўскае (е,Е)вангелле, (б,Б)іблія, (е,Е)вангелле, (с,С)татут (в,В)ялікага (к,К)нязтва (л,Л)ітоўскага,9 (м,М)ая – (д,Д)зень (п,П)ерамогі.

*Дзядова А.С.*

# Спецкурс №8
# Марфеміка. Словаўтварэнне

**Заданне 1.** Запішыце жаночыя варыянты да прапанаваных мужчынскіх імёнаў.

Узор: *Алесь → Алеся.*

| | |
|---|---|
| ***Ян →***<br>Сцяпан →<br>Міхал →<br>Павел → | Пятро →<br>Васіль →<br>Фёдар →<br>Стафан → |

**Заданне 2.** Размяркуйце наступныя словы паводле спосабу ўтварэння і назавіце яго. Зрабіце марфемны і словаўтваральны аналіз падкрэсленых слоў.

Шэравокі, бязрогі, развесяліцца, пераначаваць, палёт, пяцівугольнік, падгаворваць, умацоўваць, ружовенькі, нясмелы, жытнёвы, густалісты, бяздымны, прыдарожны.

**Заданне 3.** Запоўніце табліцу.

| **Вытворнае слова** | **Слова(ы), якое(ія) стала(і) базай для ўтварэння** | *Спосаб утварэння* |
|---|---|---|
| збегчыся | | |
| загс | | |
| | без рукі | |
| | сам | марфолага-сінтаксічны (або канверсія, транспазіцыя) |
| упарадкаваць | | |

**Заданне 4.** Выпішыце выдзеленыя словы. Пісьмова вызначце іх склад і спосаб іх утварэння.

Гарыць агонь. Каля *зямлянкі*
Аб доме тужаць *землякі*,
А маладыя *партызанкі*
Пякуць і сушаць *праснакі*. (П. Глебка)

**Заданне 5.** Настаўнік прапанаваў вучню адказаць на пытанне, як маглі быць утвораны словы ***дзяржзаказ, зернясклад, каморнік, надхмар'е, бондар, піск, бландзін, мінулае** (успомнілася)**, загс, плытагон.*** Адказ атрымаўся наступны. Прааналізуйце гэты адказ, выпраўце і патлумачце дапушчаныя недакладнасці.

1. *Дзяржзаказ* утварылася ад словазлучэння *дзяржаўны заказ*, спосаб утварэння — абрэвіяцыя.
2. *Зернясклад* — ад словазлучэння *склад для зерня*, спосаб утварэння — словаскладанне.
3. *Каморнік* — ад слова *камора*, спосаб утварэння — суфіксальны.
4. *Надхмар'е* — ад *хмара*, спосаб утварэння — прыставачна-суфіксальны.
5. *Бондар* — ад слова *бонда*, спосаб утварэння — суфіксальны.
6. *Піск* — ад дзеяслова *пішчаць*, спосаб утварэння — нульсуфіксальны.
7. *Бландзін* — слова невытворнае.
8. *Мінулае* — слова невытворнае.
9. *Загс* — ад спалучэння *аддзел забеспячэння афармлення грамадзянскіх службаў*, спосаб утварэння — абрэвіяцыя.
10. *Плытагон* — ад словазлучэння *ганяць плыты*, спосаб утварэння — складана-нульсуфіксальны.

**Заданне 6.** Да кожнага з вытворных слоў напішыце ўтваральную аснову (базу). Графічна абазначце словаўтваральныя сродкі.

| | |
|---|---|
| *пагрузачны ←*<br>*перагрузка ←*<br>*назіральны ←*<br>*адсталасць ←*<br>*паўтарэнне ←*<br>*сустрэчны ←*<br>*засушлівы ←*<br>*гоначны ←* | *канюшня ←*<br>*куплены ←*<br>*салёны ←*<br>*паказчык ←*<br>*бурлівісты ←*<br>*вокліч ←*<br>*садоўнік ←* |

**Заданне 7.** Зрабіце словаўтваральны разбор наступных слоў:

| **Базавае(ыя) слова(ы)** | Утворанае слова. Фарманты | **Спосаб утварэння** |
|---|---|---|
| 1) | *раззбраенне* | |
| 2) | *адмыслова* | |
| 3) | *блакіт* | |
| 4) | *мастацкі* | |
| 5) | *паўтарэнне* | |
| 6) | *вадаправодны* | |
| 7) | *прыдарожны* | |
| 8) | *прыгажосць* | |
| 9) | *подпіс* | |

**Заданне 8.** Прыдумайце па 6 складаных прыметнікаў са злучальнымі галоснымі і запішыце іх. Назавіце спосабы іх утварэння.

**Заданне 9.** Растлумачце, якой прыметай матывавана кожнае выдзеленае курсівам у тэксце слова.

Не выбіраем,
Спрытна зразаем
Шапкі, галоўкі
*Ababкам,*
*Радоўкам,*
*Ваўнянкам,*
*Бялянкам,*
*Таўстушкам,*
*Гаркушкам*. *(Хв. Жычка)*

**Заданне 10.** Зрабіце марфемны і словаўтваральны аналіз слоў:

*Бессмяротны*
*някідкай*
*прыгарадны*
*разгублены*
*перанаселенасць*
*садоўнік*
*выдатнік*
*лыжніца*
*па-людску*

Дзядова А.С.

# Спецкурс №9
# Марфеміка. Словаўтварэнне

**Заданне 1.** Прааналізуйце прыведзеныя словазлучэнні і запішыце, што абазначаюць словы з прыстаўкаю ***-па.***

1) пасарамаціць гультая —
2) пасароміць свавольнікаў —
3) жаданае памор'е —
4) своечасовая паверка —
5) спартыўны паядынак —
6) цікавае павер'е —

**Заданне 2.** Вызначце, якія з наступных слоў маюць прыстаўкі, і абазначце іх.

Абавязаць, абсушыць, абысці, абязлічыць, выдатнік, даатрымаць, залёт, занепакоены, нааблузваць, наапашкі.

**Заданне 3.** Пакажыце, як можна падзяліць на марфемы наступныя словы і як зменіцца пры гэтым іх значэнне. Да кожнага слова прывядзіце па 2 аднакаранёвыя словы:

| | |
|---|---|
| 1) адабраць — | адабраць — |
| 2) адорваць — | адорваць — |
| 3) выраз — | выраз — |
| 4) горка — | горка — |

**Заданне 4.** Абазначце ў кожным слове корань. Выпішыце пары аднакаранёвых слоў. Растлумачце, як называюцца карані, вызначаныя ў нявыпісаных словах.

*Вадзянік, нізіна, вуліца, загарнуць, саліць, рэзаць, саліст, водны, сігаць, рэзкі, завулак, марскі, нізкавата, марыць, гаротны, дасягнуць.*

**Заданне 5.** Падкрэсліце толькі словы з <u>дзвюма</u> літарамі ў корані. Пакажыце іх марфемны склад:

*Апякаць, абутак, браць, дабаўка, двойка, замкнуць, звялы, звычка, пашыў, смех.*

**Заданне 6.** Вызначце марфемны склад слоў:

*Старажытны, вярнуўшыся, напісана, паселішча, дазвалялася, насустрач, самастойна.*

**Заданне 7.** Абазначце канчаткі ў словах:

*Трыма, пяццюдзесяцц, чытаў, васьмюстамі, бараніліся, купацца, камусьці, чаго-небудзь.*

**Заданне 8.** Запішыце, якія часціны мовы могуць мець наступныя марфемы. Падмацуйце кожны выпадак прыкладамі.

***-я*, *-уч-*, *-яе*, *-ць*, *-ў*, *-ячы*, *я* □.**

**Заданне 9.** Запішыце 10 суфіксаў, якія выкарыстоўваюцца ў бел. мове пры ўтварэнні <u>асабовых</u> назоўнікаў <u>мужч. роду</u>, а таксама па 2 назоўнікі, утвораныя пры дапамозе гэтых суфіксаў. Гл. узор на першым слове.

| *Суфікс* | *Назоўнікі* |
|---|---|
| 1. *-ак (-як)* | *асіл-ак, рыб-ак, мар-ак, бядн-як* |
| | |
| | |

| | |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

**Заданне 10.** Пісьмова адкажыце на наступныя пытанні.

| | |
|---|---|
| **1.** Якое слова па сваёй семантыцы **выпадае з агульнага рада:** *сялянства, студэнцтва, духавенства, грамадзянства, чыноўніцтва?* Падкрэсліце яго і патлумачце сваё рашэнне | |
| **2.** Хто **лішні** ў кампаніі музыкантаў: *флейтыст, раяліст, акардэаніст, гітарыст, альтыст, гарманіст*? Падкрэсліце яго і | |

*Дзядова А.С.*

## Спецкурс № 10
## Марфалогія. Назоўнік

**Заданне 1.** Ці выпадкова ў наступным дыялогу рыфмуюцца рэплікі? Чым гэта можна ратлумачыць? Знайдзіце ў тэксце ўласцівыя беларускай мове формулы моўнага этыкету і граматычныя формы.

–Дзень добры, Кліму!

–Але, але, капаю гліну.

–Што ты, Клім, ужо аглух?

–Сам капаю, а не ўдвух.

–Ці не бачыў ты мае казы?

–Накапаў ужо тры вазы.

–Ці даўно ты стаў не чуць?

–Бывай, суседзе, здароў будзь!

**Заданне 2.** Якую памылку не заўважылі рэдактары “Збору твораў” У. Караткевіча ў наступным сказе:

*На бярвеннях дзяўчаты запелі пра вячэрнюю стому сваю*. (У.Караткевіч)

**Заданне 3.** З наступнымі назоўнікамі складзіце па 2 словазлучэнні ці сказы, паставіўшы назоўнікі ў родным склоне адзіночнага ліку. У адным выпадку назоўнік павінен мець канчатак *-а,* а ў другім – *-у.*

Лістапад, дуб, народ, пад’езд.

**Заданне 4.** Пастаўце наступныя назоўнікі ў **М. склоне** адз. л.

Гамбург, шалаш, ганак, трактар, Глеб, брыль, Янка Брыль, дырэктар, морж, Іван Мележ, пух, чытач, цар, млын, мост, Кастусь, мядзведзь, рэвізор, пасаг, футбол, Андрэй, мост, архіпелаг, руль, гарох, сцяг, ланцуг, чай, лоб, скрутак, гай.

**Заданне 5.** Якія нормы літаратурнай мовы парушаны ў наступным сказе?

*Вышыня сяквоі дасягае сто пяцьдзесят метраў, а дыяметр пятнаццаць метраў.*

1. Арфаграфічныя і граматычныя. 2. Пунктуацыйныя. 3. Моўна-стылістычныя.

**Заданне 6.** Прытрымліваючыся рыфмы, устаўце прапушчаныя словы ў вершы С. Гаўрусёва. На прыкладзе якіх назоўнікаў можна праілюстраваць асаблівасці марфалогіі беларускай мовы ў параўнанні з рускай?

Што там бялеее – ранні снег ці гусі селі на ….? Праймае грудзі халадок, як быццам босы стаў на …. . Плячом апёршыся на …., апошні ліст раняе дуб. І сівер – з ярасці …. – малоціць лёд ва ўсе цапы.

**Заданне 7.** Прачытайце ўрывак з твора А. Бязлепкінай “Улляна, альбо Нарадзі ў сабе гейшу”. Запішыце, на якую граматычную памылку звярнуў увагу прафесар і чаму?

– Улляна, Вы ўжо самі зразумелі, што пісаць – гэта праца. І цяжкая праца… Я не магу сказаць, што Вы непісьменная, Вы, хутчэй, няўважлівая. Ну што гэта за назва “Ноч на бігудзях”?

**Заданне 8.** Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.

Железнодорожная насыпь –…; неправильная дробь –…; третья перепись –…; некачественный гонт –…; древнерусская летопись –…; едкая арь –…; кислый щавель –…; гречневая крупа –…; пойти за водою –… ; жениться на студентке –…; пойти за водою –…; поблагодарить брата –…; сердечное спасибо –…; старше сестры –….

**Заданне 9.** Запішыце словы па-беларуску, дапасаваўшы да іх прыметнікі.

Живопись –…; риск –…; паводок –…; стебель –…; бровь –…; ежевика –…; блюдце –…; земляника

**Заданне 10.** Падкрэсліце ў кожным радзе *чацвёртае лішняе* слова. У дужках коратка растлумачце свой выбар.

1) вароты, азёры, дамы́, сталы;

2) задавака, дзяўчына, задзіра, валацуга;

3) радасць, цень, ростань, восень;

4) Сочы, Тбілісі, Осла, Місісіпі.

Дзядова А.С.

# Спецкурс № 11
## Марфалогія.Прыметнік. Займеннік. Лічэбнік

**Заданне 1.** Адзначце сказы з парушэннем граматычнай нормы ва ўжыванні ступеней параўнання прыметнікаў. Запішыце гэтыя сказы правільна.

1.Этыкетная паслядоўнасць прывітанняў: маладзейшы вітае старэйшага, мужчына – жанчыну, маладзейшы па чыну – старэйшага.

2. На чале роду стаяў старэйшына – самы стары і паважаны прадстаўнік роду.

3. Самы старэйшы кенійскі школьнік, 88-гадовы Кімані Нганга Маруге, вымушаны быў пакінуць парту і адправіцца ў дом састарэлых.

4. Самы стары храм Гародні – Барысаглебскую царкву XII стагоддзя, якую звычайна называюць Каложскай царквой, або проста Каложай, чакае рэстаўрацыя і адбудова.

5. Найвышэйшых паказчыкаў па намалоце збожжа дасягнулі Іваноў Алег Анатольевіч, старэйшы камбайнер, і Паграбецкі Аляксей Леанідавіч, якія намалацілі 1201,9 тоны збожжа, убралі 416 гектараў.

**Заданне 2.** Знайдзіце словазлучэнні *з граматычнымі памылкамі* і запішыце пад іх нумарамі выпраўленыя варыянты.

1. Каля двух цэлых і адной трэцяй бочкі. 2. Тры вялікія рыбіны. 3. З чатырыста пяцьцюдзесяццю трыма скрынкамі. 4. З дзвюмастамі двума малюнкамі. 5. У двухстах сарака дзвюх тонах. 6. У дзвюх цэлых і дзвюх дзясятых грама. 7. Адзін цэлы і тры сотыя кілаграма. 8. Да чатырох тысяч дзвюхсот дзевяноста дзвюх тон. 9. З паўтары тысячамі рублёў. 10. Дзве цэлыя і сем дзясятых шклянкі. 11. Паміж дзвюмястамі трыццаццю двума вучнямі.

**Заданне 3.** Выпішыце з тэксту лічэбнікі і запішыце іх словамі ў творным склоне. Вызначце, якімі часцінамі мовы з'яўляюцца падкрэсленыя словы.

<u>Колькі</u> стралялі зуброў у Белавежы!

Восень, 27 верасня. 1752 год. Кароль Аўгуст III палюе. Разам са сваёй жонкай – вялікай каралеваю. У гэты дзень яе вялікасць каралева забіла 20 зуброў і прачытала каля 50 старонак сентыментальнага рамана.

1860 год. <u>Таксама</u> верасень. Палюе цар Аляксандр II. З усёй пушчы пад яго стрэлы было <u>сагнана</u> 117 зуброў, 100 зайцаў, 3 ласі, 23 дзікі, 36 коз, 14 ланяў, 17 ваўкоў, 15 ліс, 14 барсукоў. Усяго 339 галоў.

Але зубр, <u>нягледзячы</u> <u>на</u> здзек і ганьбаванне, не пакінуў сваю Белавежу. <u>Вучоныя</u> <u>нават</u> зрабілі вывады, што пушча захавалася <u>толькі</u> <u>таму</u>, што ў ёй былі зубры, а зубры захаваліся толькі таму, што была пушча. *(Паводле Я. Сіпакова)*

**Заданне 4.** А) Прывядзіце як мага больш фразеалагізмаў, у склад якіх уваходзяць лічэбнікі.

Б) Запішыце лікі лічбамі, а затым словамі ў Т. склоне.

668; 900-ы; 412; $^{3}/_{15}$; 0, 02; $^{4}/_{5}$; 3,003; 64,3; 213; 311-мільённы.

**Заданне 5.** Выпішыце нумары сказаў *з граматычнымі памылкамі* ва ўжыванні займеннікаў.

1.Чужое возьмеш – сабе на карысць не пойдзе. 2. Я цябе такое раскажу, што ў цябе адпадзе ахвота пярэчыць. 3. Не стаў сабе дачасна помнік і ў бяссмерце не спяшы, лаві не ўласнай славы промні, а сонца кожнае душы. *(П.Панчанка)* 4. Каля самога плоту раслі крапіва і чыстацел. 5. Мне хацелася не раз самаму́ ўзляцець у неба. 6. Сусед раіў Андрэю пагаварыць з сынам, але ён яго не паслухаўся. 7. Падышоў к са́маму берагу і зірнуў уніз.

8. Прыдбаў сябе ў ”Букінісце” рэдкую кнігу. 9. Ніхто не зробіць горш табе, чым сам сабе. 10. Па падворку хадзіў ніхто іншы, як сын. 11. Каля берага ракі стаяў разложысты дуб. Калі ён параўняўся з ім, то пачуў брэх сабакі. 12. Госці з’ехалі, дык не з кім нават і пагаварыць. 13. Які-ніякі, а ўсё-такі свой дом. 14. Ідучы ў войска, сын папрасіў маму не выкідваць свае сшыткі. 15. Табе, шчодры сялянскі стол, хочацца сказаць ласкавае слова. (Я. Сіпакоў) 16. Калі на галінку пераскоквала вавёрка, з яе сыпаўся снег.

**Заданне 6.** Прывядзіце як мага больш прыкладаў прыналежных прыметнікаў, якія выступаюць у ролі якасных.

**Заданне 7.** Удзельнікам школьнай алімпіяды па беларускай мове быў прапанаваны для перакладу наступны тэкст на рускай мове.

*Человеку важно знать свои корни – отдельному человеку, семье, народу. Тогда и воздух, которым мы дышим, будет целебен и вкусен, дороже будет взратившая нас земля и легче будет почувствовать назначение и смысл человеческой жизни. Давайте же будем помнить об этих корнях. (В.Песков)*

У аднаго вучня атрымаўся такі пераклад:

*Чалавеку важна знаць свае корні – асобнаму чалавеку, сям’е, народу. Тады і паветра, якім мы дышам, будзе цалебна і смачна, даражэй будзе ўзрасціўшая нас зямля і лягчэй будзе спасцігнуць прызначэнне і сэнс чалавечага жыцця. Давайце ж будзем памятаць аб гэтых карнях!*

Уявіце сябе ў ролі настаўніка і выпраўце дапушчаныя памылкі, моўныя недахопы, запісаўшы тэкст правільна. На прыкладзе якіх слоў і словазлучэнняў можна праілюстраваць адметныя рысы беларускай марфалогіі? Якія сказы (часткі сказаў) з’яўляюцца аднасастаўнымі? Вызначце іх тыпы.

**Заданне 8.** Выпішыце займеннікі і ўкажыце іх разрады.

Вітаю працай кожны дзень і адчуваю, што з гадамі мне хочацца любіць людзей усё мацней, усё адданей. Усе яны – мая радня. І з імі помню я заўсёды: народ мой вечны, як зямля, я – зерне ў глыбіні народа. (Л. Дайнека)

**Заданне 9.** У якіх сказах словазлучэнні з займеннікам *самы (самая, самае)* выражаюць ‘*меру, ступень праяўлення якасці, прыметы дзеяння*’.

1. Настала часіна другая, усё родніцца сёння хутчэй, а самая радасць людская, што сэрцы да сэрцаў бліжэй. (*П. Броўка*)

2. Вінгеля мы ўбачылі ў самай гушчыні кустоў. (*К. Чорны*)

3. Гарохам сыпле Богут словы, а самы тон яго прамоў то памяркоўны, то суровы. (*Якуб Колас*)

4. “Адтуль, адтуль заходзь – там самая рыба ходзіць!” – радзіць дзед. (*М. Лынькоў*)

5. Другая частка песні была спакайнейшая, але самы спеў яшчэ мацней хапаў за сэрца. (*Якуб Колас*)

А) ва ўсіх сказах; Б) 1, 4; В) 2, 3, 4; Г) 3, 5; Д) 1, 4, 5.

**Заданне 10.** У якіх сказах сустракаюцца словазлучэнні з займеннікам *другі* ў значэнні ‘*іншы*’.

1. Другі рабочы Сцёпкаў дзень пачаўся не вельмі ўдала.

2. Тут ужо Мудрэйка спусціў нос і пастараўся пусціць гаворку ў другі бок.

3. І зробіць яшчэ Сцёпка такія выбрыкі ў паветры, што і артыст другі пазайздросціць.

4. Заняткі ў школе пачаліся другога верасня.

5. Другі баран – ні “бэ” ні “мя”, а любіць гучнае імя.

1) ва ўсіх сказах; 2) 1, 3, 4; 3) 1, 2; 4) 2, 3, 5; 5) 4,5.

*Дзядова А.С.*

# Спецкурс №12
## Марфалогія. Дзеяслоў і яго формы. Прыслоўе

**Заданне 1.** Наступныя дзеясловы пастаўце ў форме 2-й асобы мн.л. цяперашняга ці будучага часу абвеснага ладу.

Прарасціць, адпачыць, абцерці, прачнуцца, калыхнуць, грэбці, трэсціся, адаслаць, застацца, ачнуцца, сутыкнуцца, гнуцца, забраць.

**Заданне 2.** Выпраўце памылкі ва ўжыванні дзеясловаў у наступных сказах. Запішыце сказы правільна.

1. Куды вы бяжыце? 2. Так не праб'ецеся. 3. Навошта ўеце вяроўку? 4. Трэба адмерыць 5 метраў стужкі. 5. Прыходзьце, як толькі прачнецеся. 6. Скажэце, каб прыходзілі. 7. Як вы іх распазнаеце? 8. Ідзем мы ўчора па лесе і раптам бачым воўчыя сляды. 9. Мы вядзем з сабой дзяцей. 10. З якой мэтай іх бярэце з сабой? 11. Як толькі паклічу – адразу адгукнецеся. 12. Перад пачаткам новага навучальнага года мы абавязкова падстрыжэмся.

**Заданне 3.** Запоўніце табліцу.

| 2-я асоба, адз. лік | 1-я асоба, мн. лік | 2-я ас., мн. лік |
|---|---|---|
| | *перададзім* | |
| *ачнешся* | | |
| | | *сватаецеся* |
| | *нападзём* | |
| *глядзіш* | | |
| | | *застанецеся* |
| | *ляцім* | |
| *клянешся* | | |

**Заданне 4.** Выпішыце нумары словазлучэнняў з формамі дзеепрыметнікаў, якія не адпавядаюць нормам беларускай мовы.

1) працягваемая гутарка; 2) уважліва слухаючы сын; 3) атрымаўшыеся малюнкі; 4) уцалелы кавалак лесу; 5) змолатае зерне; 6) сурова насупленыя бровы; 7) парослыя мохам купіны; 8) заінетыя дрэвы; 9) зачырванеўшаяся ад марозу дзяўчынка; 10) заросшы травою ручай; 11) засмажанны кавалак; 12) асветляныя сонцам паляны; 13) засыплены лісцем; 14) куплены на ўласныя грошы.

**Заданне 5** . Выпішыце **нумары** сказаў з граматычнымі памылкамі ва ўжыванні дзеепрыметнікаў. Вусна растлумачце, чаму вы гэтыя формы дзеепрыметнікаў аднеслі да памылковых.

1. Ён быў дагледжаны, падпраўлены і нядаўна пабелены, гэты журботны напамінак вайны. *(В. Б.)* 2. Невялікая магілка з завялай травою і высахлымі немудрагелістымі вянкамі старанна падраўняна; пагабляваныя штыкеціны агароджы афарбаваны зялёнай фарбай — як і належыць вайскоўцам. *(В. Б.)* 3. Прылажыўся дзед Талаш — і гулкі стрэл здрыгануў лясную глухмень, і трыумфуючы воўк таксама падскочыў угору і асунуўся, як мяшок. 4. У бары густым настоен пах смалісты. Падаслан пад ногі хвоям мох пушысты. 5. Кветцы засохшай зноў не цвісці. 6. Паветра было насычана ап'яняючым водарам жытнёвага поля. 7. Сярод папераў пастарэўшых, сярод запыленых лістоў радкі даўно забытых вершаў неспадзявана я знайшоў. 8. Апусцеўшае поле захмурнела высахшым бульнікам. 9. Усе гузікі папрышываты. 10. Навокал пляцоўкі пастаўлены плот, закладзен падмурак вялікага дома. 11. Жыве загінуўшы герой у светлай памяці людской. 12. Адгукніся, вясна, мне зязюляй з-за рэчкі, дай яшчэ раз прыпасці да любай

зямлі і каштанаў сваіх незгасальныя свечкі над маёй адшумеўшай вясной запалі. 13. Скінуты межы, свет разгароджан. 14. Імжа перайшла ў спарнеючы дождж. 15. Пышным, некранутым ростам стаяла трава — маладая, яшчэ не набраўшая ні соку, ні гушчыні свайго колеру. 16. Наўздагон веснавой сіле імчыцца вясёлая пераклічка прыляцеўшых птушак. 17. Пачуў плач прачнуўшыхся і прагаладаўшыхся дзяцей, потым убачыў цётку, вяртаючуюся з лесу.

**Заданне 6.** Выпішыце нумары сказаў з памылкамі ва ўжыванні ці ва ўтварэнні дзеепрыслоўяў. Вусна пракаменціруйце, у чым заключаецца кожная памылка.

1. Прыбегшы ў спякотны дзень да ракі, нельга разгарачанаму адразу кідацца ў ваду. 2. Не чытаўшы кніг, не вучыўшы ўрокаў, не спадзявайся на поспехі ў навуцы. 3. Слухаючы выступленне спявачкі, у людзей на сэрцы станавілася лягчэй. 4. Было так ціха, што чуваць было, як недзе, зашыўшыся ў траву, цвірчэў конік. 5. Ад'язджаючы ў горад і надоўга развітваючыся з роднымі мясцінамі, у мяне моцна заные ў сэрцы, балюча зашчыміць у грудзях. 6. Развітваючыся з гаспадаром, госці адразу паехалі ў горад. 7. Было чуваць, як плешча, гуляючы ў вадзе, рыба, як злосна гудуць, пралятаючы блізка каля агню, чорныя рагатыя жукі. 8. Паціху дагараўшы, дровы зрэдку ўспыхвалі дымком. 9. Прыехаўшы ранкам у лес па грыбы, там было ўжо светла. 10. Дайшоўшы да свайго старога селішча, не маглі, каб не зазірнуць на яго. 11. Ён ціха, нерухома ляжаў, з асалодай адчуваючы, як цела прыемна ные ад стомы. 12. Успомніўшы каля дошкі даўно прачытаны твор, вучань хмурыў бровы, моршчыў лоб і чухаў патыліцу. 13. Тут, ля возера, яго душа нібыта выпроствалася і замірала, прагнучы толькі цішыні і прыгажосці. 14. Кучаравая вішня ўжо адцвітала, шчодра сыпаўшы на зямлю свае белыя пялёсткі.

**Заданне 7.** Выправіце памылкі ва ўжыванні дзеепрыслоўяў, карыстаючыся другім прыёмам выпраўлення .

1. Пад'язджаючы да горада, у мяне з галавы зляцеў капялюш. 2. Седзячы на беразе рэчкі, з ім і здарылася бяда. 3. Пракапаўшы канаўку, асушыцца поле. 4. Вяртаючыся пад праліўным даждджом дамоў, на мне не было сухой ніткі. 5. Гледзячы на танцы дзяцей, сэрца радуецца. 6. Уволю папрацаваўшы і папалуднаваўшы, соладка адпачываецца.

**Заданне 8.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Якімі сродкамі перакладу дзеепрыметнікаў на беларускую мову вы карысталіся?

Одуванчики

Солнце ушло в черные глухие дымящиеся тучи, и пятый день беспрерывно шли дожди, и было холодно, как осенью. Оранжевые на солнце одуванчики прикрылись длинными узкими листьями и теперь целый день стояли, словно в пальто с поднятым воротником, раскачиваемые ветром, вечно заплаканные и унылые.

Неужели пройдет жизнь, и вот так, под дождем, станут седыми одуванчики, и ветер развеет их в прах, и останутся в высокой траве только твердые белые костыльки как память, что был на свете золотой одуванчик и не успел в жизни ничего увидеть? (Б. Ямпольский)

**Заданне 9.** Словы якой часціны мовы адсутнічаюць у прапанаваным тэксце?

Хай гавораць, што нібыта
Біты варты двух нябітых;
Я па вопыту здабытым
Раю быць табе не бітым. (А.Александровіч)

**Заданне 10.** Запішыце прыслоўі і блізкія да іх спалучэнні **злітна, асобна** ці **праз злучок.** Вусна растлумачце іх правапіс.

Апрануцца па/святочнаму; звярнулі ў/бок вёскі; паехалі чамусьці ў/бок; закалола ў/бок; воляй/няволяй усё/ж зрабілі; вывучыць як/след; глянуць у/высь; гэтак/сама

размалявалі; дзейнічаць за/адно; друкаваць у/потайкі; жылі з людзьмі ў/адкрытую; з/даўна́ павялося; знаходзіцца не/па/далёку; зрабілі па/твойму; імкнуцца на/перад; ісці на/практкі; калёсы коцяцца па/волі; на/во/шта сказаў; на/ляту ўдарыцца; не/зважаючы ні/на/што; несці пад/пахай; не/ў/меру языкаты; падкрасціся з/заду; паехаць на/сустрач; пашыць касцюм у/абцяжку; перадаваліся не/ў/час; перш/на/перш трэба супакоіцца; прадзірацца на/вобмацак; прыляталі што/лета; прынесці ў/двая больш; разумець па/рознаму; расказваць па/памяці; распрануўся на/хаду; расці па/абапал сцежкі; рухацца ў/перад; сабрацца ў/пяцярых; славіцца з/давён; сустрэліся ў/восень; схаваць за/пазуху; сям/там віднеліся; у/трох хутчэй зробім; заблудзіўся у/трох соснах; часу ў/абрэз; чытаць у/голас; што/дзень успаміналі.

*Дзядова А.С.*

# Спецкурс №13
# Сінтаксіс

**Заданне 1.** Знайдзіце памылкі ў пабудове словазлучэнняў. Запішыце словазлучэнні правільна.

Партнёр па танцам, дбаць за дзяцей, дом у тры паверхі, пачцівы да старых, турнір па тэнісу, імунітэт на хваробу, у мэтах паляпшэння вучобы, гатовы к цяжкасцям, адзнака па маляванню, не выканаць з-за ляноты, працаваць па вечарам, хворы сэрцам, брат маладзей мяне, пісаць па адрасе, сшытак па маляванню, спазніцца з-за дажджу, дзякаваць бацькоў, два вялізных возера, у трох кроках ад мэты, падысці к дубу, выбраць па сваім гусце.

**Заданне 2.** Вызначце граматычную аснову ў наступных сказах. Укажыце тыпы выказнікаў.

1. Надзвычай ясная, спакойная раніца выдалася ў гэты дзень. (Я.Колас)
2. Жартаўнік агеньчык гэты! (Я.Колас)
3. Ісці было прыемна і лёгка. (І.Шамякін)
4. Паветра было густа настоена на хвоі. (Т.Хадкевіч)
5. Дрэвы ля дома стаялі жоўтыя, залацістыя. (Я.Сіпакоў)
6. Навокал млына быў густы альховы зараснік. (К.Чорны)
7. Прыемна размаўляць з такім сардэчным і шчырым чалавекам.
8. Вось-вось павінен быў прачнуцца ў збожжы першы жаваранак. (Я.Брыль)
9. Гарачая была гэта раніца. (Я.Колас)
10. Я буду наведваць вас часта. (І.Шамякін)

**Заданне 3.** Вызначце сінтаксічную ролю інфінітыва ў наступных сказах.

1. Радасць – сустрэцца з чалавекам ветлым, прыемнасць – пагутарыць з чалавекам разумным, шчасце – жыць, працаваць з чалавекам сумленным (В. Вітка). 2. Спасцігаць новае – вялікая асалода.3. Дзяцінства іншы раз дапамагае выбраць занятак на ўсё жыццё (І. Навуменка). 4. Паступіў загад спыніцца. 5. Пасля заняткаў пойдзем з сяброўкай у бібліятэку пісаць рэферат. 6. Нагрэцца сеў на комін абветраны бацян ( У. Мазго). 7. Хадзіць жа далей у пушчу бацька ім строга забараніў (І. Навуменка). 8. Угаварыць яго … было немагчыма. (В. Быкаў). 9.Найвышэйшы абавязак – узгадаваць і выхаваць чалавека (М. Лужанін). 10. Гурбы – не ўзабрацца. 11. Школьнікі запрасілі на сустрэчу паэта пачытаць свае новыя вершы. 12. Спаць не магла да святла, на шарэнніку ўставала, п'янела ад лебяды, ад кропу. ... Яшчэ не ўмела ў горы хіліцца, яшчэ не ўмела маці хваліцца. Так і не спасцігла цяжкой навукі — стаяць рукі ў бокі, сядзець склаўшы рукі (Р. Барадулін).

**Заданне 4.** Вызначце і запішыце, якому структурнаму тыпу адпавядаюць прыведзеныя фразеалагізмы-сказы.

| Фразеалагізм-сказ | Структурная разнавіднасць фразеалагізма |
|---|---|
| Абое рабое | |
| Якая кошка прабегла | |
| Макавай расінкі ў роце не было | |
| Снегу леташняга не дапросішся | |
| Як серада на пятніцу | |
| Дзе ракі зімуюць | |

**Заданне 5.** Прачытайце наступны сказ: *У суботу пойдзем у тэатр.*

Пры дапамозе якіх сінтаксічных сродкаў можна паказаць адносіны гаворачага да зместу таго, пра што гаворыцца ў сказе?

**Заданне 6.** Размяжуйце намінатыўныя сказы і канструкцыі, знешне падобныя да іх.

1. Сонейка. Клёкат бусліхі. (Л. Геніюш) 2. Спякота. Лівень. Сіні гром. Раскрыла лета ўсе вароты, і хоча кожны жаўтароты дастаць да гэтых дзіў крылом. (А. Пысін). 3.Касавіца. Ліпень напачатку. (У. Някляеў). 4. Навокал лес. Гушчарнік. Калматыя елкі. Выносістыя, нібы свечкі, прамыя сосны. Пад шатамі елак і соснаў мурашнік. (С. Кухараў). 5.Даручылі жаўруку свет будзіць на золаку. Ну і жаўрук! (М. Танк). 6. Максім Багдановіч… Кароткі быў яго жыццёвы век. (А. Бачыла). 7.“Сцюдзёны вырай”. Так назваў Брыль першую частку рамана “Птушкі і гнёзды”. (У. Юрэвіч). 8.Вось і роднае Падгор’е, а якое ж тут надвор’е! І цяплей, і сонца болей па-над борам, па-над полем.(Я. Пушча). 9.Асенніх дзён журлівая імжа. Туман густы над чорнымі палямі.(А. Грачанікаў). 10.Вясенні вечар на ўзлессі сінім. Бярэзнічак. Іржавы мох балота. (У. Караткевіч). 11.О Нарач! Сэрца я прынёс табе. (А. Звонак)

**Заданне 7.** Запішыце сказы. Вызначце параўнальныя звароты. Растлумачце знакі прыпынку. 1.І дзе на свеце ёсць такая, як Нёман, рэчанька другая? (Я. Колас). 2. Пах травы быў не такі, як у сярэдзіне лета. 3.Вочы твае нада мной узышлі сузор’ямі цеплыні, сусветамі дабрыні ... ( Р.Барадулін).4. Летняя ноч як зайцаў хвост.5. Вочы нібы дзве чарэшні ў дождж. 6. Калі хто скажа, што даўно… няма ў каханні таямніцы, не верце: і яму яшчэ прысніцца яно, як цуд нязнанай чысціні. І ён, як невядомыя дары, адшукваць будзе для прызнання словы, каб спаконвечнае адкрыць нанова і тайну тайнаў паўтарыць (Г. Бураўкін).7. Навошта прыручаць яго цугляць – няхай яно, як вецер, будзе вольным і неаб’езджаным, бы ў стэпе дзікім коні. Яму, як птушцы, дайце пакрыляць. Не дакранайцеся да гэтай чысціні – яго ж у знемажэнні ўспамінаюць… Няхай яно, нявіннае, звініць, як свята, – слова чыстае: “Кахаю!” (Я. Сіпакоў). 8. Над дарогай – туман ці пыл. Ля дарогі – маўклівы сад. І гудуць, і гудуць слупы, як і дзесяць гадоў назад. І над сцежкаю палявой васількамі – мае гады… Ці то зоркі над галавой, ці то яблынь цяжкія плады. (Г. Бураўкін). 9.Каля ног гараць брусніцы – нібы ў красках летні луг. (Г. Бураўкін).

**Заданне 8**. Запоўніце табліцу, указаўшы ролю слоў ***калі*** і ***як*** і тып сказаў, у якіх яны ўжываюцца.

| **Сказ** | **Тып сказа** | **Роля слова *калі*** |
|---|---|---|
| **1.** *У той дзень, **калі** яны сустрэліся, зацвіла чаромха.* | | Злучальнае слова |
| **2.** | Складаназалежны з даданай дапаўняльнай | |
| **3.** *Яму было вядома, **калі** прывязуць новыя падручнікі* | | |
| **4.** | Складаназалежны з даданай акалічнас-най умовы | Злучнік |

| Сказ | Тып сказа | Роля слова *як* |
|---|---|---|
| *1. Ірынка адразу ведала, як зрабіць гэтае заданне* | | |
| **2.** | Складаназалежны з даданай параўнальнай часткай | Злучнік |
| **3.** *Як даведаешся пра час пачатку спаборніцтваў, пазвані мне.* | | |
| **4.** | Складаназалежны з даданай акалічнас-най часу | Злучнік |

**Заданне 9.** Дапоўніце часткі наступных прыказак і прымавак, пабудаваных па схеме складаназалежнага сказа. Дайце структурную характарыстыку адноўленым часткам.

| | | |
|---|---|---|
| 1. Дзе нявесткі ў хаце тры, … | | |
| 2. Няхай з грэчкі будзе мак,… | | |
| 3 …., што і масла хлебам мажуць. | | |
| 4. …, каб хто касу насіў. | | |
| 5. Хто не ідзе, … | | |

**Заданне 10.** Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку. Зрабіце поўны сінтаксічны разбор сказаў.

Не самае важнае дзе ён жыў і дзе пісаў свае творы. Але важна для нас тое што ён усё сваё жыццё шчымліва спавядаўся ў любові да роднай зямлі якая яго нарадзіла якая ўзгадавала яго сваімі песнямі і казкамі. Ён казаў што ў казках і песнях беларусаў схавана ўся прыгажосць зямлі радаваўся што беларуская мова “найбольш гарманічная і найменш перакручаная з усіх славянскіх дыялектаў” і што “няма народа чысцейшага чым нашы калтуністыя беларусы”. (Янка Сіпакоў пра Адама Міцкевіча)

*Дзядова А.С.*

# Спецкурс №14
# Сінтаксіс. Словазлучэнне. Просты сказ

**Заданне 1.** Знайдзіце памылкі ў пабудове словазлучэнняў. Запішыце словазлучэнні правільна.

Працаваць па вечарам, хворы сэрцам, брат маладзей мяне, пісаць па адрасе, альбом па маляванню, спазніцца з-за дажджу, дзякаваць бацькоў, два вялізных возера, у трох кроках ад мэты, падысці к дубу, дбаць за дзяцей, дом у тры паверхі, пачцівы да старых, турнір па тэнісу, імунітэт на хваробу, у мэтах паляпшэння вучобы.

**Заданне 2.** Выпішыце **нумары** словазлучэнняў з граматычнымі памылкамі.

1) два тваіх брата; 2) гэты зазнайка вечна адзін; 3) пасмейвацца над няўмекай; 4) ён разумней цябе; 5) пайсці па грыбы.; 6) звольнілася дырэктар Марозава; 7) абедзвюмя нагамі; 8) загадчык кафедрай; 9) прабачце мяне, калі ласка; 10) стаць намнога спакайнейшым; 11) ажаніцца на суседцы; 12) загадчыца кабінета; 13) блукаць па лясам, па балотам; 14) пастукваць па сталу; 15) сустрэліся ў пяці кроках ад прыпынку; 16) даруйце яго; 17) сшытак па развіццю мовы. 18) Трое хлапчукоў спяшаліся да мурашніка. 19) Над кім кпіла, смяялася, таму і дасталася. 20) Жнівеньскія дні не даўжэйшыя ліпеньскіх. 21) Урач Іванова наведаў хворага. 22) Тры браты на адным кані па беламу полю едуць. 23) Трэба было аддзякаваць малых за тое, што прынеслі добрую вестку. 24) Адвакат Пятрова бліскуча выйграла судовы працэс. 25) За дабро, зробленае табе, пастарайся аддзячыць чалавека дабром.

**Заданне 3.** Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.

Водить по стеклу; встречаться по четвергам; честен и справедлив по отношению к другим; извините меня за опоздание; посмеяться над своими неудачами; пойти в лес за грибами; послать за доктором; поехать за дровами; болеть туберкулёзом; требователен к себе; в двух шагах от озера; два невысоких деревца; две пятых тетради; заведующий лабораторией.

**Заданне 4.** Запішыце, якімі членамі сказа з’яўляюцца выдзеленыя словы, вызначце іх від.

| Сказ | Член сказа |
|---|---|
| ***Дай слова***, што абавязкова прыедзеш. | |
| ***Дай сказаць*** мне толькі некалькі слоў. | |
| ***Дай лейцы***, я дапамагу. | |
| ***Дай напішу*** гэта на дошцы. | |
| ***Дай згоду*** *на ўдзел у спаборніцтвах.* | |

**Заданне 5.** Устанавіце адпаведнасць паміж сказамі і іх тыпамі. Адказ запішыце літарамі і адпаведнымі лічбамі, напрыклад:

**А 6; Б 1…**

| | |
|---|---|
| **А.** Знайсці падкову — шчасце. | **1.** Абагульнена-асабовы |
| **Б.** Кменам, і смажанай рыбай**,** і ветрам падзьмула з гары. | **2.** Назыўны (намінатыўны) |
| **В.** Над полем цішыня і золак. | **3.** Пэўна-асабовы |
| **Г.** Збіралі толькі добрае шчаўе і заечую | **4.** Няпэўна-асабовы |

| | |
|---|---|
| капусту | |
| **Д.** Люблю цябе**,** лес**,** за тваю чалавечую шчодрасць. | **5.** Безасабовы |
| **Е.** Вось і Гарынь**,** глыбокая**,** шырокая**,** імклівая. | **6.** Двухсастаўны |
| **Ж.** Выбірай нявестку не ў карагодзе, а на агародзе. | **7.** Інфінітыўны |

**Заданне 6.** Вызначце назыўныя сказы, выкарыстаныя Якубам Коласам у радках з верша "Песняй вітаю я вас". Пастаўце і запішыце лічэбнік, які абазначае колькасць назыўных сказаў, у форме творнага склону.

Скінуты межы, свет разгароджан –
Далеч, бязмежны прастор.
Яснае заўтра….

**Заданне 7.** Прачытайце наступны сказ: *Дождж хутка скончыцца.*

Пры дапамозе якіх сінтаксічных сродкаў можна паказаць адносіны гаворачага да зместу таго, пра шо гаворыцца ў сказе?

**Заданне 8.** Вызначце характар структурных і семантычных адрозненняў для наступных пар сказаў.

1. Шмат каму ўспомніцца глыбіні марской таемны холад. – Слоў не хочацца кідаць на ўзвей-вецер.

2. Разгалістае зялёнае дрэва ўяўляецца мачтай. – Пастуху салодка спіцца на траве-пярыне.

3. Хіба дзеду сівому і ўспомніцца глыбіні рачной дзіўны свет. – Ой, як ціха пяецца пра лясок невысок, пра Марусіна сэрца і яе паясок.

**Заданне 9.** Адзначце, які(я) з прыведзеных прыкладаў адпавядае(юць) наступнаму азначэнню: *"Сказ, у якім выражаецца значэнне павіннасці, неабходнасці, немагчымасці, непазбежнасці, пажаданасці, мэтазгоднасці дзеяння ці меркаванне адносна яго ажыццяўлення".* Вызначце тып гэтых сказаў.

| Сказ | Тып сказа |
|---|---|
| 1. Паслухаць бы драздоў свістанне ў час ружовага світання. | |
| 2. Пахам мядовым дыхнула ад дрэў. | |
| 3. На граніцы паласу барануюць, нібы ў полі. | |
| 4. Нам пройдзеных дарог не перамераць і нанава нікому не прайсці. | |
| 5. Там ліры гук і посвіст косаў злучу ў адзін нячутны хор. | |

.

**Заданне 10.** Запішыце, якім членам сказа з'яўляюцца выдзеленыя курсівам словы і ў якім склоне яны стаяць.

1. Гарадскія *бібліятэкі* павінны забяспечваць усім неабходным спецыяльныя базы кніжнага гандлю.

2. *Гэта* – літаратурны музей народнага паэта Беларусі Янкі Купалы.

3. У конкурсе юных музыкантаў першы прыз атрымала *ўдзельніца* Кацярына Свірыдава.

4. *Карэджыа* называюць заснавальнікам пармскай школы жывапісу Антоніа Алегры.

5. Страшэнны штукар і *свавольнік* гэты Нёман.

*Дзядова А.С.*

## Спецкурс №15
## Сінтаксіс. Словазлучэнне. Просты сказ

**Заданне 1.** Падкрэсліце канструкцыі, якія знаходзяцца па-за межамі сістэмы словазлучэнняў.

Па-юнацку бадзёра, лататы даваць, рыхтавацца да алімпіяды, уздоўж лесу, горад Мінск, бадай поўны, іскрысты снег, паварот направа, адказваць на пытанні, дзень марозны, пайшлі адпачываць, жменя ягад.

**Заданне 2.** Патлумачце, чаму падкрэсленыя словы не з'яўляюцца аднароднымі членамі сказа.

1.Пайду назбіраю грыбоў у лесе.

2. Холадна і марозна.

3.Пасля сустрэчы з ваўком Міхаська быў ні жывы ні мертвы.

4. Ручаі, ручаі загулі, зашумелі між гор і ўзвышшаў. *(А. Астрэйка)*

5.Маці спытала пра ўрокі і як справы ў школе.

6.Здалёк чуваць, як на дарозе хтось панукае на каня і аднастайны спеў палоззя. *(М. Танк)*

7.У белым адзенні адзенні праходзіць зіма, вясна – у зялёным адзенні.

8.Зялёны бераг і жоўты пясок.

**Заданне 3.** Выпішыце толькі тыя падкрэсленыя словаспалучэнні, якія не з'яўляюцца словазлучэннямі. Ратлумачце свой выбар.

1. У адказ на ўсе пытанні настаўніцы вучань паціскаў плячыма.

2. Паэзія – расінкі зіхаценне, пралеска, што прабілася скрозь лёд, іскра ў душы, вулкан, землетрасенне, сцяг праўды, што вядзе ў бой народ.

3.Сваю любоў да роднае зямлі я не вучыўся афармляць у словы, бо слухаць урачыстыя прамовы не звычны сенажаці і палі.

4. Не было ніякага адпачынку, таму вельмі хацелася спаць, хоць трошкі звесці вочы.

5. Хлопцы ішлі ўздоўж плота.

6. Я усё часцей жадаю слухаць неба, бо на зямлі такая валтузня, што дэфіцытам стала цішыня, як у нішчымны год акраец хлеба.

**Заданне 4.** Укажыце, якімі членамі сказа з'яўляюцца выдзеленыя курсівам назоўнікі.

1.Трактар *,,Беларусь''* вядомы ў многіх краінах свету.

2. *Прыемнасць* – пазнаёміцца з чалавекам ветлым, радасць – пагутарыць з разумным, шчасце – жыць і працаваць з чалавекам сумленным. (В. Вітка)

3. *Да слёз* крануў мяне расказ старога пасечніка.

4. Ты вучыла мяне *сеяць* жыта і лён, і цярплівасці вечнай, уголас не плакаць.

5. Кланяйся, *громе,* роднаму полю, родны вітай ты мой кут!

**Заданне 5.** Укажыце, якім членам сказа з'яўляюцца падкрэсленыя словы і якой часцінай мовы яны выражаны.

1. Ляцела ўпартае ,,алё'' па правадах паштовых.

2.Паміж 981 і 983 гадамі тураўскі князь Тур быў пазбаўлены ўлады ў адным з найбольш буйных палітычных цэнтраў тагачаснай Русі.

3.У яго перахапіла дыханне.

4. Дзеда ўсюды носяць ногі, і к нам прыйдзе на хвілінку адпачыць крыху з дарогі.

5. Пешы коннаму не таварыш.

6. На сцюдзенай азёрнай вадзе, пад завеяй сярдзітай пургі, засталася сям'я лебядзей.

**Заданне 6.** Вызначце тыпы аднасастаўных сказаў.

1.Думай з вечара, а рабі зранку.2.Дзядзьку ў рыбе шанцавала.3. Пабываць бы летам на моры! 4.Звонка, музыкі, у цымбалы звініце! 5.Горы там называюць сопкамі.

**Заданне 7.** Ці можа парадак слоў уплываць на структурны тып сказа? Прывядзіце прыклады.

**Заданне 8.** Складзіце і запішыце мінімальныя кантэксты, у якіх выказванне

***Ну і надвор'е сёння!*** перадавала б супрацьлеглыя эмоцыі. Патлумачце семантыку выказвання ў кожным кантэксце.

**Заданне 9.** У ТСБЛМ назоўнік *ліса* мае два значэнні: 1. Драпежная жывёліна сямейства сабачых з вострай мордай і доўгім пушыстым хвастом, а таксама яе футра. 2. *перан.* Хітры, ліслівы чалавек. Запішыце з адпаведнымі прыкладамі: 1) якім членам сказа з'яўляецца гэтае слова ў прамым значэнні; 2) якім членам сказа з'яўляецца гэтае слова ў пераносным значэнні і чаму?

**Заданне 10.** Запішыце дэфармаваныя сказы. Выявіце, якім членам сказа з'яўляюцца злучальныя словы ў прыведзеных сказах.

1. Школа, які, узвышацца, на, горка, пабудаваць, нядаўна. 2. Школа, які, нядаўна, пабудаваць, стаць, адна, з, добры. 3. Школа, у, які, мы, вучыцца, мы, два, дом.

*Дзядова А.С.*

# Спецкурс №16
# Сінтаксіс. Складаны сказ

**Заданне 1.** Запішыце сказы, якія адпавядаюць прыведзеным схемам. Укажыце тыпы гэтых сказаў.

**Схема 1**. [Здавалася], (нібы…).
**Сказ:** ___________________________________________
**Тып:** ___________________________________________

**Схема 2**. […], (дарма што…).
**Сказ:** ___________________________________________
**Тып:** ___________________________________________

**Схема 3**. […], (ажно…)
**Сказ:** ___________________________________________
**Тып:** ___________________________________________

**Схема 4.** […усё], (што…).
**Сказ:** ___________________________________________
**Тып:** ___________________________________________

**Схема 5.** […], (ці…).
**Сказ:** ___________________________________________
**Тып:** ___________________________________________

**Заданне 2.** Спішыце сказы, расстаўце прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Назавіце тыпы сказаў.

1. Каб пад рукой барозны закіпелі рал..ю гарачым потам арашай.
2. Даруй мне час за слоў пр..сталінейнасць на ўяўнай злосці шал не наракай!
3. На стале перада мной – зборнік вершаў М. Багдановіча.
4. Дыхн..ш гл..бінным словам і адразу ўсцешна пасв..тлее на зямлі.

**Заданне 3.** Вызначце тып дадапай часткі ў наступных сказах.

1.Я не заўважыў, калі мая сталасць настала. 2.Добра, калі ў хаце чысціня і парадак. 3.Не аслабяцца рукі на полі, калі поўна надзеі душа.4.Калі ўжо сонейка прыгрэла, Антось на полі кончыў дзела і выпраг коніка сівога, свайго памочніка старога.

**Заданне 4.** Дапоўніце часткі наступных прыказак і прымавак, пабудаваных па схеме складаназалежнага сказа. Дайце структурную характарыстыку адноўленым часткам.

| | | |
|---|---|---|
| 1. Дзе пасееш густа, | | |
| 2. Няхай з грэчкі будзе мак, | | |
| 3. Дзе гаспадар ходзіць, | | |
| 4. Дзе дровы сякуць, | | |
| 5. Хто не ідзе, | | |

**Заданне 5.** Вусна ўзнавіце знакі прыпынку. Запішыце сказы, якія адпавядаюць схемам:

а) [ ] – [ выражае дадатковае паведамленне ];

б) [ ] : [ паясняе, удакладняе слова ў першай частцы];

в) [ ] : [ дапаўняе першую частку].

1. На зямлю сырую ціха ночка пала бляскам-дрыгаценнем зорка замігала.
2. Бывае так паміж клапотаў, між працы тлумных вечароў агорне часам адзінота.
3. Агнявыя валаконцы ткуцца ў шоўк чырвоны гэта хмаркі ладзяць сонцу і зямлі карону.
4. Спадала гарачыня гусцелі фарбы навакольля духмяна пахла лугавой травой.
5. Як зманьвае, як спакушае пражытае як хочацца скупануцца ў светлай і жывой вадзе былых дзён!
6. Біяграфія ў песні маёй і ў мяне адна пад дзіравай страхой гадаваліся я і яна.
7. У Лынькова было яшчэ адно, як цяпер кажуць, хобі ён любіў фатаграфаваць праз агонь.
8. Цяпер я з гонарам магу сказаць нішто так не ўзвышае, не падымае на п’едэстал духоўнай годнасці чалавека, як мастацкая літаратура.
9. Цёплым крылом махне вясна расцвітаюць яблыні зноў.
10. Іван Мележ сцвярджаў усёй сілай свайго таленту гэтыя людзі не для паказу вам жывуць, не дзеля экзатычнай забаўкі.

**Заданне 6.** Прывядзіце прыклады бяззлучнікавых складаных сказаў у адпаведнасці са схемамі. Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку.

1) [ ] [ хуткая змена падзей ];

2) [ ] [супастаўленне з’яў, падзей ] ;

3) [ ] [ вынік ];

4) [ ] [ прамое пытанне];

5) [ ] [ неадпаведнасць зместу];

6) [ ] [тлумачэнне].

**Заданне 7.** Выберыце правільны варыянт пастаноўкі знакаў прыпынку ў наступным сказе.

*Толькі калі падрос я зразумеў чаму мама так моцна любіла вясну з вясной у яе была звязана надзея на ўрадлівае лета рупную восень і негалодную зіму.*

1. Працяжнік, коска, працяжнік, коска.
2. Коска, двукроп’е, працяжнік, коска.
3. Працяжнік, коска, двукроп’е, коска.
4. Коска, коска, двукроп’е, коска.

**Заданне 8.** Зрабіце поўны сінтаксічны разбор складанага сказа.

Перад самымі вачыма Верасоўскага ціха сам сабою як усё роўна яго нехта зачапіў пагойдваўся рамонак які формаю нібы паўтараў сонца і гэты рамонак абуджаў у ім нейкі невыразны ўспамін але ён спрасоння не хацеў дашуквацца яго. (Я. Сіпакоў)

**Заданне 9.** Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку. Зрабіце поўны сінтаксічны разбор складанага сказа. Працягніце тэкст з выкарыстаннем цікавых фактаў з жыццёвай і творчай біяграфіі М. Багдановіча, ужываючы пры гэтым розныя тыпы складаных сказаў.

Славу гораду як і зямлі робяць славутыя людзі. У гэтым сэнсе Гародні пашэнціла ў ёй жыло нямала выдатных славутых людзей і сярод іх наш першы інтэлігент у літаратуры тонкі і трагічны Максім Багдановіч.

**Заданне 10.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Расстаўце ў сказах патрэбныя знакі прыпынку.

Мифы Древней Греции

Легенды и предания сложенные древними греками создавались в те далёкие времена когда люди только начинали вглядываться в окружающий их мир только приступали к его исследованию и объяснению.

Одну за другой мешая правду и вымысел придумывали и рассказывали друг другу удивительные истории о том как возник мир и что его наполняет почему по бурному морю бегут белые барашки-волны почему люди бывают то смелыми и мудрыми то глупыми и трусливыми откуда берётся отголосок в лесу точно повторяющий в тишине каждое громко сказанное слово.

Как живые глядят и сейчас на нас из этих древних преданий слагавшие их тысячелетия назад люди простодушные доверчивые любопытные и по-своему мудрые. (По Л.Успенскому)

*Дзядова А.С.*

**Спецкурс № 17**
**Сінтаксічныя і пунктуацыйныя нормы**

**Заданне 1.** Адзначце сказы, у якіх ёсць памылкі ва ўжыванні дзеепрыметнікавых і дзеепрыслоўных зваротаў:

а) Па лясной сцежцы, засланай залатым дываном лісця, ішлі тры чалавекі;

б) На густа абсыпаных дрэвах снегам не варушылася ні адна галінка;

в) Прыклаўшы вуха да дзвярэй, Волька прыслухалася;

г) Выйшаўшы на двор, на Рамана дыхнула набліжэнне вясны;

д) Выбягаючы з хаты на двор, Лёнька падцягнуўся на галіне старой грушы.

**Заданне 2.** Адзначце сказы, у якіх ёсць памылкі ў сувязі дзейніка і выказніка:

а) Усе прысутныя выказаліся супраць прапановы аб’яднаць дзве гаспадаркі;

б) Усяго пяць чалавек прыйшлі на дадатковыя заняткі па матэматыцы;

в) Большасць нашых людзей не хацела, каб асушалі балота за вёскай;

г) Безліч прапаноў паступіла ад жыхароў новага мікрараёна;

д) Праходзіць год за годам, а нічога не мяняецца ў аблічча старога горада.

**Заданне 3.** Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пры аднародных членах пастаўлены правільна:

а) Хвілін колькі я не мог знайсці сабе месца, потым усё ж не вытрымаў, падсеў да стала, узяў з-пад абруса хлеб і адшчыпнуў крошачку, потым яшчэ адну і яшчэ...;

б) Я гляджу цяпер на гэты роў, і ў шуме вады чую далёкую старажытнасць;

в) Рыгор ішоў наперадзе, адхіляў галлё і трымаў у руках, пакуль пройдзе Зося, потым выпускаў яго, а сам зноў забягаў наперад;

г) Усюды: на дарозе, у абочынах, на парыжэлай траве ляжала лісце, якое час ад часу ўзлятала ўгору і кружылася ў пыльнай завірусе;

д) Ляснічы нетаропка, па-гаспадарску агледзеў агароджу каля крынічкі, паправіў кладку да яе, каб падарожны змог падысці да яе ў кожную пару года.

**Заданне 4.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы выдзяляюцца з двух бакоў коскамі:

а) У непрыкметнай лясной вёсачцы ***каля вялікай ракі*** жыве не старая яшчэ жанчына;

б) У сакавіку ***здараецца*** ноччу ідзе дождж;

в) Убачыўшы, што сабака нешта пачуў, чалавек насцярожыўся і ***трымаючы стрэльбу напагатове*** пачаў паціху набліжацца;

г) У лесе было сыра і ***нават*** зябка;

д) О ***жуpавы*** ляціце сваёй дарогай, вясёлай і шумнай, як крыгаход!

**Заданне 5.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:

а) Цякуць рэкі ў мора_ і вырастаюць да неба дрэвы;

б) Увосень у Бярозаўцы мялела рака_ і рана жаўцелі бярозы;

в) Колькі харaства_ і колькі мудрага задумення ў асеннім лесе!

г) Сонца павярнула на захад_ у небе застылі ружовыя хмары_ і на пасеку з балотца падзьмуў халадок;

д) Лабановіч не мог адвесці вачэй ад купчастых хмар-грамадзін_ і ўвесь аддаўся чарам зямлі і неба.

**Заданне 6.** Адзначце сказы з рознымі відамі сувязі частак, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:

а) У твар шыбала прыемным халадком, а на ўзгорках сустрэчны паток паветра быў сухі і цёплы, што проста не верылася ў пачатак восені;

б) Дзе-кольвечы ў канавах і ярах яшчэ ляжыць апошні снег, але паводка ўжо адбушавала, пакінуўшы ў нізінах часовыя азёры, у якіх нібы ў вялізных люстэрках адбівалася ружова-блакітнае неба;

в) Стаяла якраз тая пара восені, калі пачырванелы асіннік у лесе ўжо трывожна шапоча пра заканчэнне лета, а над асірацелымі лугамі згасае духмянасць пасохлых траў і кветак;

г) І дзіўная рэч: сам Фурсевіч так захапіўся чытаннем, што на яго твары заззяла радасная ўсмешка а сам ён нібыта папрыгажэў;

д) Было ціха і вакол панавалі такая яснасць і спакой, якія бываюць у полі толькі ўвосень.

**Заданне 7.** Адзначце сказы з простай мовай, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:

а) “Эй вы, слухайце!” – крыкнуў Янка Тукала, звяртаючыся да сяброў і стараючыся перакрычаць іх. – Давайце заспяваем песню!”;

б) “Агонь! Агонь!” – крыкнуў Віктар, ачухаўшыся, і кінуўся да вогнішча;

в) “Ці не сын ты таго Пятра, што бунтаваў мне народ? – успомніў пан, чырванеючы ад злосці, і залямантаваў: Узяць яго!”;

г) “Заходзьце ў хату, – смеючыся, сказала гаспадыня. – А каня я сама распрагу”;

д) Вяз памаўчаў, а потым, махнуўшы галінаю, сказаў: “Гэта не агонь”.

**Тэкст да заданняў 8-10**

(1) Толькі дабегчы да лесу Іван не паспеў. (2) Ён лез па траве ўгору, мінаючы вялікія і малыя абломкі скал з рассыпанай навокал жарствою, і ўжо амаль дасягнуў хваёвага ўзлеску, як ззаду, вынырнуўшы з-за пагорка, гучна і раз’юшана забрахалі сабакі. (3) Іван кінуўся ўбок, да маладой ялінкі, і, прыгнуўшыся, выглянуў між хваін__ цераз бугор, мільгаючы ў траве, па ягоных слядах імчалася нямецкая аўчарка. (4) Тады ён, зразумеўшы, што да гушчару ўжо не паспець, шырэй расставіў ногі і мацней сцяў у кулаку пісталет. (5) Стоячы за ялінай, Іван прыгнуўся, позіркам адмераў якую паўсотню крокаў да каменнага абломка ў траве і скіраваў туды пісталет. (6) Аўчарка магутнымі скачкамі набліжалася, прыцяўшы да галавы вушы. (7) Іван, амаль не цэлячыся, але фізічна адчуваючы напрамак яе страшнага бегу, стрэліў. (8) Сабака віскнуў, з шалёнага маху скочыў, перакуліўся цераз галаву і за якіх крокаў дваццаць ад яго забіўся, затузаўся ў траве ўсім целам.

**Заданне 8.** Вызначце тып маўлення ________________

**Заданне 9.** Вызначце, які знак прыпынку трэба паставіць у 3-м сказе на месцы пропуску ________

**Заданне 10.** Запішыце нумары сказаў з аднароднымі выказнікамі ______________________

*Дзядова А.С.*

# Спецкурс № 18
# Сінтаксічныя і пунктуацыйныя нормы

**Заданне 1.** Адзначце сказы, у якіх ёсць памылкі ва ўжыванні дзеепрыметнікавых і дзеепрыслоўных зваротаў:

а) Над лесасекай, зарослай густымі кустамі арэшніку, плыло павуціннне;

б) Яны ішлі праз лес глухой, замеценай дарогай снегам, на якой не было відаць ні следу, ні каляіны;

в) Заслухаўшыся песняй жаваранка, ляснік не адразу пачуў гул машыны;

г) Едучы па мястэчку, гаворка на возе не перапынялася;

д) Паліваючы кветкі, дзяўчаты пайшлі дадому.

**Заданне 2.** Адзначце сказы, у якіх ёсць памылкі ў сувязі дзейніка і выказніка:

а) Гэтыя людзі не хацелі мірыцца з несправядлівасцю;

б) Толькі шэсць хлопцаў падала заявы на допуск да экзамену;

в) Большасць рэчаў былі завезены назаўтра;

г) Група моладзі чакала аўтобуса на прыпынку;

д) Мінула тыдняў сем.

**Заданне 3.** Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пры аднародных членах пастаўлены правільна:

а) І матчыны словы і ласка яе і такі знаёмы дамашні пах зноў вярнулі Івану адчуванне радасці жыцця;

б) Саша доўга стаяў на ўзлессі, прытуліўшыся плячом да сасны і нервова круціў у руках лазіну;

в) Прырода ўмее гаварыць і ствараць настрой, і лагоду, толькі трэба ўмець яе слухаць;

г) Вясна, кажуць, прыгожая ўсюды: у полі, у лесе, у горадзе;

д) Па звычцы мець заўсёды пры сабе ўсё: гайкі, шурупы і іншыя дробныя дэталі Сяргей і лісток дубовы машынальна паклаў у кішэню.

**Заданне 4.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы выдзяляюцца з двух бакоў коскамі:

а) Недалёка ад дубоў ***на скошаным лузе*** пасвіліся статкі;

б) Але сонца ўжо не магло як след нагрэць зямлю і паветра, і ***нават*** у гэты ясны дзень адчувалася восень;

в) У паветры было ціха, толькі звон красак зліваўся ў адну доўгую песню, і ***здавалася*** прырода была закалыхана гэтым звонам;

г) Ліпа была такая старая, што ледзьве трымалася, і ***крыху схіліўшыся да будынка*** толькі чакала буры;

д) ***Здавалася*** Васілю, што пасядзіць трохі, адпачне, а там можна зноў устаць, зноў ісці.

**Заданне 5.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:

а) Кіламетры праз тры пачаўся лес_ і тут адразу стала спакойна і ціха;

б) Як у люстэрка, глядзішся ты ў прыроду, чалавек_ і бярэш ад яе і душэўнасць, і ласку, і мудрасць;

в) Я гляджу цяпер на гэты роў_ і ў шуме вады чую далёкую старажытнасць;

г) Замаразкі ўсё мацнелі і мацнелі_ і ўжо раніцамі зямля адзывалася пад нагамі лёгкім звонам_ і кожны крок быў чуваць за некалькі кіламетраў па ўсім наваколлі;

д) Мне ж хацелася падыхаць свежым паветрам_ і я выйшаў наверх.

**Заданне 6.** Адзначце сказы з рознымі відамі сувязі частак, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:

а) Яшчэ сон звівае павекі, іх цяжка разарваць і галава яшчэ не зусім прачнулася, а ўжо радасць, што зноў дома, як быццам і не з'язджаў адсюль ніколі, радасць звароту ў самога сабе;

б) Спачатку начаваў алень у катлаване, дзе стаяла наша гармата, але першыя стрэлы моцна напалохалі няшчасную жывёліну, і ён стаў баязліва абыходзіць гарматы і пазбягаць сваіх старых сяброў;

в) А потым на двары, пастукаўшы ў шыбу, напружана чакаеш, калі пачуецца лёгкі шоргат і жывое варушэнне на печы, і з плячэй быццам гара зваліцца;

г) Жыццё многіх людскіх пакаленняў прайшло перад дубамі, і праходзіць, нібы тыя хвалі Нёмана, што пакручастай змейкай абвівае высокі роўны груд, а яны ўсё стаяць, спакойныя і важныя, і жывуць сваім асобным жыццём;

д) Пасярод паляны стаялі два стажкі сена і адзін з іх быў так абскубаны знізу, што нагадваў грыб, і нельга было не здзівіцца, як ён не паваліцца ад першага подыху ветру.

**Заданне 7.**Адзначце сказы з простай мовай, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:

а) "Няўжо ўсё? Няўжо не будзе Пеці? – шапталі яе вусны. – Трэба плысці!"

б) "Бач ты, усё з'елі", – абрадаваўся ляснік;

в) "Трэба пашукаць у рэчцы", – сказаў сусед, бо ўзяць чужую рэч у нас ніхто не мог;

г) І супраць дзедавай волі з яго грудзей вырваўся голас – "Хто ідзе?";

д) "Дабравольцаў няма, – змрочна заключыў Галадай і дадаў: – Тады пацягнем".

**Тэкст да заданняў 8-10**

(1) Белая ад снегу зямля зіхаціць у ранішнім сонцы. (2) На тэрмометры, прымацаваным да рамы акна, слупок упаў да трыццаці.

(3) На пустэчы за гумном стаяць кусты лопуху, на якія апусцілася чародка жвавых сінічак. (4) Мароз даймае іх моцна, і нездарма лясныя птушкі перабіраюцца бліжэй да чалавечага жылля. (5) Здаецца, зусім нядаўна ў хмызняках і садах весела стракаталі, спявалі свае песні пярнатыя наведвальнікі, бо летам і ўвосень ім была раскоша__ насення, насякомых, іх лічынак хапала на ўсіх. (6) А цяпер, калі ўся зямля пакрыта снегавой коўдрай, птушкам туга.

(7) Вялізнае сонца апускаецца, павольна коціцца за лес. (8) Ружовы захад палымнее шырока і зырка, але вось ён згасае і цямнее, робіцца нібыта барвовым. (9) А неўзабаве, быццам чараўнік раскінуў агністыя самацветы, на пацямнелым небе ўспыхнулі зоркі.

**Заданне 8.** Вызначце тып маўлення __________________

**Заданне 9.** Вызначце, які знак прыпынку трэба паставіць у 5-м сказе на месцы пропуску _____

**Заданне 10.**Запішыце нумары сказаў з двума і больш радамі аднародных членаў сказа _________

*Дзядова А.С.*

# Спецкурс №19
# Словазлучэнне і сказ у тэксце

**Заданне 1.**Адзначце словазлучэнні, у якіх сувязь паміж словамі кіраванне:

1) захапляцца краявідамі; 2) сёмы параграф; 3) спяваць утрох; 4) працаваць без адпачынку; 5) шчыра дзякаваць.

**Заданне 2.**Адзначце сказы з аднароднымі азначэннямі (знакі прыпынку не пастаўлены):

1) Вавёрка адшукала буйны закруглены жолуд; 2) За возерам выйшлі да парку замглёнага сцішэлага; 3) Маруда прынізіў струмень вады і паласнуў ім па рыжай ужо здранцвелай пад лёгкім марозам гліне; 4) Каштанавыя іскрыстыя пад сонцам валасы хлопца ляжалі буйнымі хвалямі; 5) Дым быў горкі кіслы.

**Заданне 3.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы адасабляюцца:

1) ***Малаком запіўшы вячэру*** мы дзякуем за баравічкі Сярожку, дзякуем Еўдакіі Рыгораўне і падымаемся з-за стала; 2) Падлоўчы хадзіў ***перавальваючыся***, і здавалася, што яму вельмі было цяжка падымаць ногі; 3) Вакол свечкі ***сашчапіўшы рукі на грудзях і прыціснуўшы локці да бакоў*** расхаджваў нейкі кудлаты чалавек і нешта мармытаў; 4) Сядзець ***склаўшы рукі*** было сумна; 5) Пачуўся званок, і Серж горда ўвайшоў у клас ***з усмешкай паглядаючы на ўсіх***.

**Заданне 4.** Адзначце сказы з устаўнымі канструкцыямі (знакі прыпынку не пастаўлены): 1) Там у Парыжы і Ліёне паспяхова прайшлі мастацкія выстаўкі “Беларускі нацыянальны касцюм” арганізаваныя вядомым фалькларыстам прафесарам Міхасём Раманюком; 2) Старая алешына з колам на вяршку мусіць зацягнуў Марцін для буслоў але на ім крычалі аж давячыся вароны берагла гэты грудок ад паводкі; 3) Гаспадара не чуваць застаўся на ганку? і ўсё бліжэй бліжэй да пуні гаспадыніны крокі; 4) Немец зноў відаць не зразумеў сэнсу слова; 5) Лес стаяў заінелы пусты і халодны як парожняя пуня.

**Заданне 5.** Адзначце складаназлучаныя сказы (знакі прыпынку не пастаўлены): 1) У грудзях Васілька стала прыемна і цёпла быццам улілася туды жывая вада; 2) У кабінет з чародкай вучняў увайшла Вольга зірнула на Насцю потым на дошку і села за свой стол праз адзін рад ад Насці; 3) А вечарамі храбусцелі льдзінкі ў лужынах і востра пахла зямлёй мазутам і каменным вугалем; 4) Слых у леапарда тонкі а сон лёгкі і чуйны; 5) Прырэчная імшарына разам з ракой крута паварочвала ўбок наперадзе між кустоўя засінеўся хвойны грудок і Хведар Роўба запаволіў хаду гатовы зусім спыніцца.

**Заданне 6.** Адзначце складаназалежныя сказы з дадзенымі дапаўняльнымі часткамі (знакі прыпынку не пастаўлены): 1) Валянцін Васільевіч папрасіў каб нам прынеслі па кубку гарбаты; 2) Зачыніў Алесь дзверцы ў печцы каб галавешка на падлогу не вывалілася за стол сеў і пачаў задачы рашаць; 3) Хоць матрац быў спружынны і змякчаў падзенне усе стараліся скокнуць як мага далей на падушкі; 4) Мірон адчуў што тут яго ўжо даўным-даўно перасталі чакаць; 5) Стаяў Андрэй у лесе глядзеў на пралескі што нібы кавалачкі неба сінелі тут і там любаваўся імі.

## Тэкст для заданняў 7-10

(1) Раптам па-за кустамі ціхенька хруснула. (2) Уздрыгануліся хлопцы, азірнуліся __ у кустах стаіць казуля, зграбная, прыгожая. (3) Задраўшы галаву з невялікімі рагамі, на якіх было па два атожылкі, яна скубла маладыя парасткі, і на шыі яе відаць была белая пляма. (4) Кожны момант яна азіралася, уздрыгвала і была гатовая знікнуць.

**Заданне 7.**Знайдзіце ў тэксце аднасастаўны сказ. Вызначце яго від

**Заданне 8.** Які знак прыпынку прапушчаны ў 2-м сказе? Адказ запішыце ____________________

**Заданне 9.** Знайдзіце ў тэксце складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак. Адзначце віды сувязі, якія ў ім спалучаюцца: 1) злучальная і падпарадкавальная; 2) бяззлучнікавая і злучальная; 3) бяззлучнікавая і падпарадкавальная; 4) бяззлучнікавая, злучальная і падпарадкавальная; 5) паслядоўная і сузалежная.

**Заданне 10.** Вызначце стыль тэксту _____________

Дзядова А.С.

## Спецкурс № 20
## Словазлучэнне і сказ у тэксце

**Заданне 1.** Адзначце словазлучэнні, у якіх парушаны граматычныя нормы: 1) хворы на ангіну; 2) дзякаваць сяброў; 3) даглядаць за куранятамі; 4) жартаваць над аднакласнікам; 5) ажаніцца са Святланай.

**Заданне 2.** Адзначце сказы з састаўнымі іменнымі выказнікамі: 1) Дзядзька Пятрусь быў жартаўнік; 2) А лес зрабіўся сівым і паважным; 3) А пушча не сунімалася, стагнала, гула, бушавала, плакала злосным плачам, выла гневам і нянавісцю; 4) Крэсла вялікае, прасторнае; 5) Ляснік і дзяўчынка пачалі збіраць падарункі старога дуба і акуратна ссыпаць іх у дупло.

**Заданне 3.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы адасабляюцца: 1) Радавы Блін стаяў ***анямелы***; 2) ***Апанаваны пэўнаю мэтай*** я пабрыў па дарозе на ўсход; 3) Лёгкі і цёплы ветрык пагойдвае галінкі ***ўпрыгожаныя ярка-зялёнымі лістамі***; 4) ***Стомленыя днём і работай*** адпачывалі лётчыкі; 5) Пад яблынямі ў садзе стаялі ***збітыя з дошак*** сталы і лавы.

**Заданне 4.** Адзначце сказы з пабочнымі канструкцыямі (знакі прыпынку не пастаўлены): 1) Іду ўзбярэжжам Свіцязі і здаецца наступаю на сляды самога Адама Міцкевіча; 2) Густы сасновы лес здаецца бясконцым; 3) Юнак зусім разгубіўся нават адступіў нібы хацеў схавацца за спіны іншых; 4) Вецер гэта як сцвярджаюць даведнікі ўсяго толькі рух паветра над зямной паверхняй; 5) На шчасце ветрык падзьмуў у другі бок.

**Заданне 5.**Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы і словазлучэнні выдзяляюцца коскамі: 1) Дзе ты ***зорка мая прамяністая*** за якія ты хмары скацілася? 2) ***Вы*** пражылі жыццё, многа чаго бачылі, ведаеце; 3) Моцна кахаў я цябе ***дарагая*** але расстацца нам час; 4) ***Ты*** таксама каля мамы ціха-ціхенька ляжы; 5) Зазвані моцна ***звон*** загудзі, каб пачулі цябе на ўвесь край.

**Заданне 6.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх правільна пастаўлены знакі прыпынку паміж часткамі: 1) Чую: гавораць двое; 2) Святлелі дахі дамоў: празрыста-зялёнымі рабіліся вяршыні бяроз у блізкім парку; 3) Спадзяваўся парадавацца прыемным паэтычным набыткам, свежым, яркім сучасным вершам – не атрымалася; 4) Коні з хрыпам задзіралі галовы, у чыстым паветры далёка разносіліся выкрыкі хлопцаў, стралялі з-пад капытоў камякі снегу; 5) У грудзях зашчымела ад нядобрага прадчування – з Васілём нешта здарылася!

### Тэкст для заданняў 7-10

Ліда ўзяла з паліцы падручнік і села каля стала. Паспрабавала чытаць, але гоман хлапчукоў, што даносіўся з кабінета Андрэя Іванавіча, развейваў увагу. Тады ўстала, шчыльней прычыніла дзверы, села зноў і затуліла далонямі вушы. Дзяўчынка так паглыбілася ў кніжку, што не чула, як бабуля ўпусціла Віцю, які падкраўся і закрыў ёй вочы рукамі.

**Заданне 7.** Знайдзіце ў тэксце просты няпоўны сказ. Які член сказа ў ім апушчаны? __________

**Заданне 8.** Знайдзіце ў тэксце складаназалежны сказ з некалькімі даданымі часткамі. Вызначце від падпарадкавання ________________

**Заданне 9.** Знайдзіце ў тэксце складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак. Адзначце віды сувязі, якія ў ім спалучаюцца: 1) злучальная і падпарадкавальная; 2) бяззлучнікавая

і злучальная; 3) бяззлучнікавая і падпарадкавальная; 4) бяззлучнікавая, злучальная і падпарадкавальная; 5) паслядоўная і сузалежная.

**Заданне 10.** Вызначце тып тэксту __________________________________

*Дзядова А.С.*

**Спецкурс №21**
**Пунктуацыя**

**Заданне 1.** Адзначце правільнае сцвярджэнне:

Пунктуацыя – гэта: 1) раздзел граматыкі, у якім вывучаюцца заканамернасці спалучэння слоў у словазлучэнні і сказе, будова сказаў, а таксама іх тыпы; 2) раздзел мовазнаўства, які вывучае пунктуацыйную сістэму, што складаецца з сукупнасці знакаў прыпынку і правіл іх выкарыстання ў пісьмовым тэксце.

**Заданне 2.** Адзначце правільнае сцвярджэнне:

Пунктуацыйныя нормы рэгулююць: 1) правільнасць ужывання знакаў прыпынку для афармлення пэўных сінтаксічных адзінак пры дзеянні пэўных умоў; 2) правільнасць пабудовы сінтаксічных канструкцый, ужывання прыназоўнікаў з рознымі склонавымі формамі назоўнікаў і займеннікаў.

**Заданне 3.** Адзначце сказы, у якіх правільна расстаўлены знакі прыпынку:

1) Кожны помніць рабіну, бярозу, ці клён пад акном; 2) І лугам, і касагорам, нівам, пушчам і азёрам сонца шле прамень; 3) За ціхім сасновым лесам паказалася знаёмае вялікае бульбяное поле; 4) У схеме асушэння і асваення балот, і забалочаных зямель Палескай нізіны прадугледжваўся не проста спуск вады, а збор яе ў вадасховішча; 5) Усё на свеце: і хатнія турботы, і школа, і гэты клопат з Галяй, усё адсунулася кудысьці далёка.

**Заданне 4.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў неабходна паставіць коску (коскі):

1) Начамі свяціў месяц_ поўны і даўгавечны; 2) За адзінаццаць гадоў навучання чалавек вырастае_ як асоба; 3) Вельмі ўсхвалявала Якуба Коласа сустрэча з героем яго аповесці_ дзедам Талашом; 4) Пасля вайны ён_ Андрэй_ перабраўся жыць на кватэру да Арцёма Гаўрылавіча; 5) На голых дрэвах_ замест лісця_ паклалі шэрань маразы.

**Заданне 5.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў неабходна паставіць коску (коскі):

1) Шкодна чытаць_ лежачы; 2) Вочы_ нібы васількі; 3) Пацяжэлі і паплылі_ пераварочваючыся і дыхаючы холадам_ снегавыя хмары; 4) Нягледзячы на ранні час_ тут пульсавала жыццё; 5) Ападаў ветравы холад і цяплела надвор’е. Аднак жа_ вецер густа халадзіў цела.

**Заданне 6.** Адзначце складаназлучаны сказ, які адпавядае наступнай схеме: [ ] і [ ].

1) Над Вязынкаю дождж імжэў_ і вербы гнуліся, як хвалі; 2) Але мінуў месяц, другі_ і вада спала; 3) У коміне вые і стогне вецер_ і гэта найлепшы акампанемент для чытання.

**Заданне 7.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх правільна расстаўлены знакі прыпынку:

1) Пасля спрэчкі хлопцы адчулі, што іх сяброўства дало вялікую расколіну, што іхнія дарогі скіраваны ў розныя бакі і што ніякія гаворкі іх ужо не злучаць; 2) Ужо такі быў гэты чалавек, што, калі закарціць у яго якое жаданне, дык даможацца свайго; 3) Дык выходзіць, што пакуль вы будзеце даказваць, я павінна стаяць убаку; 4) Я прыеду, хоць не ведаю калі; 5) Я пытаю не хто паедзе, а калі паедзем.

**Заданне 8.** Адзначце складаныя бяззлучнікавыя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць працяжнік:

1) Сухі марац, мокры май_ будзе жыта нібы гай; 2) Надыходзіла восень_ Млечны Шлях пагусцеў; 3) Адспявала лета песні, усе сабрала каласы_ пад сасонкамі на ўзлессі

расцвітаюць верасы; 4) Не паспеў стары выбрацца са снегу_ ранішнюю сціхоту перарваў стрэл.

**Заданне 9.** Адзначце складаныя бяззлучнікавыя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць двукроп'е: 1) Зайшлі на двор_ нікога не відаць; 2) Праўда гэта_ ад думак не ўцячэш; 3) І вось незабыўны малюнак_ мы спраўляем улазіны; 4) Дождж перастаў_ праглянула сонца.

**Заданне 10.** Адзначце схему, якой адпавядае пастаноўка знакаў прыпынку ў сказе з простай мовай:

**Скажыце залюбаваўшыся палацам, спытаў Рыгор ці доўга яго будавалі**

1) "П, – а, – п?"; 2) "П, – а: – П?"; 3) "П. – а. – п?"; 4) "П, – а. – П".; 5) "П", – а.

*Дзядова А.С.*

## Спецкурс №22
## Пунктуацыя

**Заданне 1.** Адзначце няправільнае сцвярджэнне:

Пунктуацыя – гэта: 1) раздзел мовазнаўства, які вывучае пунктуацыйную сістэму, што складаецца з сукупнасці знакаў прыпынку і правіл іх выкарыстання ў пісьмовым тэксце; 2) раздзел граматыкі, у якім вывучаюцца заканамернасці спалучэння слоў у словазлучэнні і сказе, будова сказаў, а таксама іх тыпы.

**Заданне 2.** Адзначце няправільнае сцвярджэнне:

Пунктуацыйныя нормы рэгулююць: 1) правільнасць пабудовы сінтаксічных канструкцый, ужывання прыназоўнікаў з рознымі склонавымі формамі назоўнікаў і займеннікаў; 2) правільнасць ужывання знакаў прыпынку для афармлення пэўных сінтаксічных адзінак пры дзеянні пэўных умоў.

**Заданне 3.** Адзначце сказы, у якіх правільна расстаўлены знакі прыпынку: 1) Хутка ўсё: неба, і дарога, і чэзлыя балотныя хмызнякі патанулі ў снежнай завірусе; 2) Побач чыгункі стаяў высокі, стары лес, таемны, пануры і важны; 3) Чайкі гуляюць над люстранай вадою, або садзяцца на вільготны пясок; 4) Поле, луг і лес пачарнелі ад золкіх асенніх дажджоў; 5) Полацк быў не толькі палітычным, але і духоўным цэнтрам княства.

**Заданне 4.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў неабходна паставіць коску (коскі): 1) За выключэннем некаторых раёнаў Палесся_ беларускую хату ніколі не беляць знадворку, толькі ўнутры; 2) Русавая, даўганогая, з далікатным тварыкам дзяўчына_ раптам спыняецца перад Васілём; 3) Мтхась з Антосем_ як старыя_ займалі месцы канцавыя; 4) Яўхім_ здзіўлены_ паглядзеў на жонку; 5) Антон быў у яго_ замест парабка.

**Заданне 5.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў неабходна паставіць коску (коскі): 1) Пад вечар таго ж дня_ ўжо на змярканні_ стаў падшумліваць вецер; 2) Крушынскі гаварыў ціха і_ не пазіраючы на госця; 3) Іван заснуў_ як пшаніцу прадаўшы; 4) Адчуўшы раптоўную знямогу ў целе_ Войцік бокам прылёг у куточку; 5) Качак пакуль што няма, аднак_ яны могуць быць.

**Заданне 6.** Адзначце складаназлучаны сказ, які адпавядае наступнай схеме: **[ ] і [ ].** 1) Увосень у Бярэзаўцы мялела рака_ і рана жаўцелі бярозы; 2) Шамацела апалае лісце пад нагамі_ і было прыемна слухаць гэта шапаценне; 3) Здаецца, бялейшыя сталі гнуткія бярозы_ і яшчэ вышэй падаліся стромкія хвойкі ды елкі.

**Заданне 7.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх правільна расстаўлены знакі прыпынку: 1) Ды Сымонка з-за трывогі ночкі жудаснай не чуў, што балелі яго ногі, і што голад яго гнуў; 2) Іван адчуваў, што калі ўпадзе ў снег, то, напэўна, болей ужо не ўстане; 3) Які настаўнік, такія яго вучні; 4) Я пытаю не хто паедзе, а калі паедзем.

**Заданне 8.** Адзначце складаныя бяззлучнікавыя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць працяжнік: 1) Мінулася поле_ пачынаўся рэдкі лясок; 2) Ціха_ пагодлівы вечар; 3) Ціха булькатала вада ў канаве, сыпалася лісце, чырыкалі недзе вераб'і_ усё гэта было такім звыклым, добрым, прыгожым; 4) Умеў памыліцца_ умей і паправіцца.

**Заданне 9.** Адзначце складаныя бяззлучнікавыя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць двукроп'е: 1) Васіль пайшоў хутчэй, угледзеўся_ перад ім, хоць і цьмяна, значылася чалавечая постаць; 2) Ціха было ў навакольных лясах_ супакоілася птаства, не шапацелі дрэвы; 3) Павучкі пluлі белае павуцінне_ яно лётала ў паветры і чаплялася за траву і галлё; 4) Сціхне бура_ ясна стане.

**Заданне 10.** Адзначце схему, якой адпавядае пастаноўка знакаў прыпынку ў сказе з простай мовай:

**Трэба дабрацца да лесу сказаў Басянкоў паспрабуем прайсці лагчынай**
1) “П, – а, – П”.; 2) “П, – а: – П”.; 3) “П. – а. – П”.; 4) “П, – а. – П”.; 5) “П”, – а.

*Дзядова А.С.*

# Спецкурс №23
# Культура маўлення

**Заданне 1**. Адзначце правільныя сцвярджэнні:

Культура маўлення – гэта: 1) навука аб правільным (нарматыўным і дасканалым) маўленні; 2) раздзел мовазнаўства, у якім вызначаюцца літаратурныя нормы на кожным моўным узроўні (арфаэпічным, акцэнталагічным, лексічным, фразеалагічным, граматычным, пунктуацыйным, стылістычным); 3) раздзел мовазнаўства, які вывучае сістэму правіл, што вызначаюць аднолькавае напісанне; 4) сістэма ўстойлівых формул зносін, прынятых у грамадстве, якія выкарыстоўваюцца ў тыповых камунікатыўных сітуацыях; 5) узорнае валоданне мовай у адпаведнасці з агульнапрынятымі нормамі.

**Заданне 2.** Адзначце словы (спалучэнні слоў), вымаўленне якіх не супадае з напісаннем:

1) перакідваць; 2) лес і возера; 3) згінуць; 4) з лесу; 5) экзамен.

**Заданне 3.** Адзначце правільна напісаныя словы (формы слоў):

1) дваццацю; 2) дагледжанны; 3) Жана; 4) паднябессе; 5) саванна.

**Заданне 4.** Адзначце прыклады, у якіх прыметнік правільна дапасаваны да назоўніка:

1) едкі гар; 2) першы сажань; 3) белы квецень; 4) непрыемны сып; 5) маладая дызайнер Марыя.

**Заданне 5**. Адзначце сказы, у якіх асобныя назоўнікі ўжываюцца ў ненарматыўнай лікавай форме:

1) У магазіне нам трэба купіць цукеркі, воцат, крупы; 2) Возера пачынаецца адразу за прысадамі, за агародамі ды садамі; 3) Алене здавалася, што вылеціць яе сэрца з грудзі ад вялікай радасці; 4) Я прапанаваў Мурцы рубную кансерву, але кошка нават не паглядзела на яе; 5) Пад насыпам засталіся рэшткі старога будынка.

**Заданне 6.** Адзначце сказы, у якіх дапушчаны адхіленні ад марфалагічнай нормы пры ўжыванні зборных назоўнікаў:

1) На хутары ў шляхцюка Радкевіча кожнае лета голлі гнуцца ад яблыкаў, груш, сліў; 2) У старым лесе часта трапляюцца паваленыя бярвенні; 3) Вецер змятае пад прызбы пажоўклае лісце; 4) Спакойна і ціха шапацелі лісці на старой грушы; 5) Рабенькае пер’е аж пераліваецца на сонейку.

**Заданне 7.** Адзначце сказы, дзе формы ступеней параўнання прыметнікаў утвораны і ўжыты з адступленнем ад нормы:

1) Міколка наважыўся падацца ў больш спакойнае месца, бліжэй да дзеда; 2) Дарога дамоў заўсёды карацейшая, чым з дому; 3) Я хачу, каб ён застаўся такі, які ён стаіць у маіх вачах: самы найлепшы для мяне куток Беларусі; 4) Няма нічога лепшага раніцы ў матчынай хаце; 5) Калі падняцца на гару і зірнуць у бок Нёмана, то перад вамі разгорнецца прыгажэйшая панарама.

**Заданне 8.** Адзначце сказы з правільным выкарыстаннем лічэбнікавых словазлучэнняў:

1) Яна ганарылася абоімі сынамі; 2) Два зялёныя яблыка ляжала на стале; 3) Да дзвюх алешын прыбіта доўгая жардзіна; 4) За паўтары тыдні мы амаль усё зрабілі; 5) Жонка мужу нешта шэпча, і абое выходзяць.

**Заданне 9.** Адзначце сказы, у якіх лічэбнікі напісаны правільна:

1) У музеі сустрэлі дваццаціпяцітысячнага наведвальніка; 2) Мы спыніліся на трыстадваццатым кіламетры; 3) Я захапілася двума апошнімі аповесцямі Івана Шамякіна; 4) Карабель з тысяча чатырыста дваццаццю пасажырамі выправіўся ў падарожжа; 5) Сямёра аднаго не чакаюць.

**Заданне 10.** Адзначце сказы з памылковым ужываннем займеннікаў:

1) Ад самога ранку касіў бацька на лузе; 2) Самога Смірнова на вайну дзяўчына не праводзіла; 3) Самага брыгадзіра на полі не было: паехаў у райцэнтр; 4) Пералівы ветру пераходзілі ў буру, і тады мора перакідвала магутныя цёмныя хвалі ледзь не да самага неба; 5) Мне самаму патрэбна дапамога.

*Дзядова А.С.*

# Спецкурс №24
# Культура маўлення

**Заданне 1**. Адзначце правільныя сцвярджэнні:

Культура маўлення – гэта: 1) навука аб правільным (нарматыўным і дасканалым) маўленні; 2) раздзел мовазнаўства, у якім вызначаюцца літаратурныя нормы на кожным моўным узроўні (арфаэпічным, акцэнталагічным, лексічным, фразеалагічным, граматычным, пунктуацыйным, стылістычным); 3) раздзел мовазнаўства, які вывучае сістэму правіл, што вызначаюць аднолькавае напісанне; 4) сістэма ўстойлівых формул зносін, прынятых у грамадстве, якія выкарыстоўваюцца ў тыповых камунікатыўных сітуацыях; 5) узорнае валоданне мовай у адпаведнасці з агульнапрынятымі нормамі.

**Заданне 2.** Адзначце словы (спалучэнні слоў), вымаўленне якіх не супадае з напісаннем:

2) перакідваць; 2) лес і возера; 3) згінуць; 4) з лесу; 5) экзамен.

**Заданне 3.** Адзначце правільна напісаныя словы (формы слоў):

2) дваццацю; 2) дагледжанны; 3) Жана; 4) паднябессе; 5) саванна.

**Заданне 4.** Адзначце прыклады, у якіх прыметнік правільна дапасаваны да назоўніка:

2) едкі гар; 2) першы сажань; 3) белы квецень; 4) непрыемны сып; 5) маладая дызайнер Марыя.

**Заданне 5**. Адзначце сказы, у якіх асобныя назоўнікі ўжываюцца ў ненарматыўнай лікавай форме:

1) У магазіне нам трэба купіць цукеркі, воцат, крупы; 2) Возера пачынаецца адразу за прысадамі, за агародамі ды садамі; 3) Алене здавалася, што вылеціць яе сэрца з грудзі ад вялікай радасці; 4) Я прапанаваў Мурцы рыбную кансерву, але кошка нават не паглядзела на яе; 5) Пад насыпам засталіся рэшткі старога будынка.

**Заданне 6.** Адзначце сказы, у якіх дапушчаны адхіленні ад марфалагічнай нормы пры ўжыванні зборных назоўнікаў:

1) На хутары ў шляхцюка Радкевіча кожнае лета голлі гнуцца ад яблыкаў, груш, сліў; 2) У старым лесе часта трапляюцца паваленыя бярвенні; 3) Вецер змятае пад прызбы пажоўклае лісце; 4) Спакойна і ціха шапацелі лісці на старой грушы; 5) Рабенькае пер'е аж пераліваецца на сонейку.

**Заданне 7.** Адзначце сказы, дзе формы ступеней параўнання прыметнікаў утвораны і ўжыты з адступленнем ад нормы:

1) Міколка наважыўся падацца ў больш спакойнае месца, бліжэй да дзеда; 2) Дарога дамоў заўсёды карацейшая, чым з дому; 3) Я хачу, каб ён застаўся такі, які ён стаіць у маіх вачах: самы найлепшы для мяне куток Беларусі; 4) Няма нічога лепшага раніцы ў матчынай хаце; 5) Калі падняцца на гару і зірнуць у бок Нёмана, то перад вамі разгорнецца прыгажэйшая панарама.

**Заданне 8.** Адзначце сказы з правільным выкарыстаннем лічэбнікавых словазлучэнняў:

1) Яна ганарылася абоімі сынамі; 2) Два зялёныя яблыка ляжала на стале; 3) Да дзвюх алешын прыбіта доўгая жардзіна; 4) За паўтары тыдні мы амаль усё зрабілі; 5) Жонка мужу нешта шэпча, і абое выходзяць.

**Заданне 9.** Адзначце сказы, у якіх лічэбнікі напісаны правільна:

1) У музеі сустрэлі дваццаціпяцітысячнага наведвальніка; 2) Мы спыніліся на трыстадваццатым кіламетры; 3) Я захапілася двума апошнімі аповесцямі Івана Шамякіна; 4) Карабель з тысяча чатырыста дваццаццю пасажырамі выправіўся ў падарожжа; 5) Сямёра аднаго не чакаюць.

**Заданне 10.** Адзначце сказы з памылковым ужываннем займеннікаў:

1) Ад самога ранку касіў бацька на лузе; 2) Самога Смірнова на вайну дзяўчына не праводзіла; 3) Самага брыгадзіра на полі не было: паехаў у райцэнтр; 4) Пералівы ветру пераходзілі ў буру, і тады мора перакідвала магутныя цёмныя хвалі ледзь не да самага неба; 5) Мне самаму патрэбна дапамога.

*Дзядова А.С.*

## Спецкурс №25
## Функцыянальная стылістыка

**Заданне 1.** Закончыце фармулёўку:

Сістэма моўных сродкаў, прызначаная для абслугоўвання шырокай сферы грамадскіх зносін – гэта ______________________________

**Заданне 2.** Адзначце функцыянальны стыль, якому найбольш уласціва функцыя ўздзеяння: а) афіцыйна-справавы; б) публіцыстычны; в) навуковы; г) мастацкі; д) гутарковы.

**Заданне 3.** Закончыце фармулёўку:

Эсэ, рэцэнзія, агляд – гэта жанры такога стылю, як ______________________

**Заданне 4.**Адзначце, да якога стылю, падстылю і жанру адносіцца тэкст:

*Шырокі гэты абшар на ўзгорках пад Вязынкай! Жывая Беларусь, апетая Янкам Купалам, паўстае перад намі – срэбныя званочкі жаўранкаў, блакітныя даляглядЫ, баравы шум... Але гэта зямля мае цяпер новы адбітак на сваім чале. Па ёй ходзяць новыя, шчаслівыя людзі. Янка Купала бачыў іх яшчэ тады, калі абуджаў у душы іхніх бацькоў пачуццё чалавечай годнасці, калі заклікаў: “Паўстаньце! Край ваш стогне родны, Заве збаўляць, як зваў не раз”:*

а) мастацкі, празаічны, апавяданне;

б) навуковы, навукова-папулярны, артыкул; в) афіцыйна-справавы, адміністрацыйна-канцылярскі, справаздача;

г) публіцыстычны, мастацка-публіцыстычны, нарыс;

д) гутарковы, размоўна-бытавы, пісьмо сябру.

**Заданне 5.** Адзначце найбольш выразную асаблівасць навуковага стылю:

а) выкарыстанне неалагізмаў, жарганізмаў, вульгарызмаў; б) наяўнасць канцылярызмаў; в) ужыванне тэрміналагічнай лексікі; г) выкарыстанне вобразных сродкаў мовы; д) наяўнасць моўных клішэ.

**Заданне 6.** Адзначце моўныя клішэ:

а) служба быту; б) згодна з пастановай; в) парытэтныя адносіны; г) сапраўднае майстэрства; д) з прапіскай у юнацтве.

**Заданне 7.** Адзначце тропы:

а) асананс; б) сімвал; в) шматзлучнікавасць; г) літота; д) сінекдаха.

**Заданне 8.** Адзначце спалучэнні, якія ўтвараюць стылістычныя фігуры:

а) паркалёвая моладзь; б) вуліца гаманіла; в) дабро і зло; г) час ідзе, час ляціць, час імчыць; д) мароз-мастак.

**Заданне 9.** Адзначце словы з эмацыянальна-экспрэсіўнай канатацыяй:

а) манафтангічны; б) забулдыга; в) семдзесят; г) Васька-жук; д) ануліраваць.

**Заданне 10.** Адзначце размоўныя фразеалагізмы:

а) ад шчырага сэрца; б) жывое слова; в) трымаць сябе ў руках; г) вушы развесіўшы; д) лезці на ражон.

*Дзядова А.С.*

**Спецкурс №26**
**Функцыянальная стылістыка**

**Заданне 1.** Закончыце фармулёўку: Перавага роднага склону назоўнікаў уласціва такому стылю, як ____________

**Заданне 2.** Закончыце фармулёўку: Пашыранасць плеанастычных канструкцый назіраецца ў такім стылі, як ________________

**Заданне 3 .** Адзначце спецыфічныя рысы публіцыстычнага стылю: а) лагічнасць; б) ацэначнасць; в) адметны характар вобразнасці; г) адсутнасць метафар; д) публічнасць.

**Заданне 4**.Закончыце фармулёўку: Інтанацыя, жэсты, міміка – характэрныя рысы такога стылю, як ______________

**Заданне 5.** Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, уласцівыя афіцыйнаму стылю: а) белае золата; б) храмасомы бюракратызму; в) у мэтах падрыхтоўкі; г) сілавыя ведамствы; д) на аснове вышэйпададзенага.

**Заданне 6.** Адзначце жанры публіцыстычнага стылю, набліжаныя да мастацкіх тэкстаў: а) рэцэнзія; б) эсэ; в) карэспандэнцыя; г) рэпартаж; д) нарыс.

**Заданне 7.** Закончыце фармулёўку: Паслядоўнасць моўных адзінак, аб’яднаных сэнсавай і практычнай сувяззю, – гэта _______________

**Заданне 8.** Закончыце фармулёўку: Тып сказа, у якім група выказніка знаходзіцца перад групай дзейніка, характэрны для такога тыпу тэксту, як __________________

**Заданне 9.** Адзначце асаблівасці разважання:

а) пералік розных прымет прадмета; б) доказ тэзіса; в) дэталёвая характарыстыка прадмета; г) агульнае ўражанне; д) вывады.

**Заданне 10.** Адзначце спосабы злучэння самастойных сказаў пры ланцужковай сувязі:

а) сінтаксічная анафара; б) лексічны паўтор; в) сінтаксічны паралелізм; г) сінонімы; д) займеннікавы паўтор.

_Дзядова А.С._

## Спецкурс №27
## Функцыянальная стылістыка

**Заданне 1.** Закончыце фармулёўку:

Сістэма моўных сродкаў, прызначаная для абслугоўвання сферы побытавых зносін – гэта ______________________________

**Заданне 2.** Адзначце функцыянальныя стылі, якім найбольш уласціва ўнармаванасць моўных сродкаў: а) афіцыйна-справавы; б) публіцыстычны; в) навуковы; г) мастацкі; д) гутарковы.

**Заданне 3.** Закончыце фармулёўку:

Манаграфія, артыкул, даклад – гэта жанры такога стылю, як ______________________________

**Заданне 4.** Адзначце, да якога стылю, падстылю і жанру адносіцца тэкст:

*Найбольшую цікавасць, як правіла, выклікаюць пытанні паходжання асобных слоў і выразаў. І гэта зразумела, таму што чалавек часам ужывае іх, не ведаючы дакладнага сэнсу, унутраных сувязей з іншымі словамі.*

*Прыгадаем, што нават дзеці дашкольнага ўзросту часам самастойна шукаюць этымалогію слоў. Аднойчы давялося пачуць: “Насоўка – гэта таму, што яна на нос насоўваецца”. Мусіць, кожны дарослы (і тым больш педагог) можа прыгадаць уласныя назіранні, якія паказваюць, як дзеці шукаюць вытокі слова.*

*Вызначэнне словаўтваральнай структуры, так неабходнае для засваення правапісу, – свайго роду этымалагічны аналіз: вылучаецца група вытворных слоў, вызначаецца іх корань, які пэўным чынам раскрывае ўнутраны сэнс слова і тлумачыць, чаму рэчы і з’явы так названы.*

а) афіцыйна-справавы, адміністрацыйна-канцылярскі, характарыстыка;

б) публіцыстычны, мастацка-публіцыстычны, эсэ;

в) навуковы, навукова-папулярны, артыкул;

г) мастацкі, празаічны, апавяданне;

д) гутарковы, размоўна-афіцыйны, паведамленне.

**Заданне 5.** *Адзначце асаблівасць, найбольш характэрную для публіцыстычнага стылю:*

а) стылізацыя; б) ужыванне індывідуальна-аўтарскіх метафар; в) выразная аўтарская пазіцыя; г) наяўнасць экспрэсіўных сінтаксічных канструкцый ва ўсіх жанрах стылю; д) выкарыстанне дзеяслоўных формаў, якія выражаюць імгненнасць дзеяння.

**Заданне 6.** *Адзначце канцылярызмы:*

а) аказанне дапамогі; б) выйсці на заслужаны адпачынак; в) спяваюць ужо жаўранкі; г) сустрэча ў вярхах; д) у мэтах падрыхтоўкі.

**Заданне 7.** *Адзначце стылістычныя фігуры:* а) анафара; б) алегорыя; в) увасабленне; г) аксюмаран; д) гіпербала.

**Заданне 8.** *Адзначце спалучэнні з тропамі:*

а) лес махае галавою; б) радасны сум; в) малінавы захад; г) сосны, нібы рыцары ў шаломах; д) моўчкі казаць.

**Заданне 9.** *Адзначце словы з функцыянальна-стылістычнай канатацыяй:* а) рэлятыўны; б) ён; в) плесціся; г) дом; д) ветразь.

**Заданне 10.** *Адзначце кніжныя фразеалагізмы:*

а) вушы вянуць; б) кануць у лету; в) заткнуць глотку; г) мафусаілаў век; д) разводзіць тары-бары.

*Дзядова А.С.*

# Спецкурс №28
# Функцыянальная стылістыка

**Заданне 1.** Закончыце фармулёўку: Ужыванне дзеяслоўных формаў цяперашняга часу са значэннем “цяперашні прадпісання” характэрна для такога стылю, як ________________________________________

**Заданне 2.** Закончыце фармулёўку: Функцыя ўздзеяння ажыццяўляецца праз выкарыстанне разнастайных стылістычных прыёмаў у сінтасісе такога стылю, як _________________

**Заданне 3.** Адзначце спецыфічныя рысы мастацкага стылю: а) славесныя рады індывідуальна-аўтарскіх метафар; б) адкрытая аўтарская пазіцыя; в) пераважна вусная форма зносін; г) эстэтычнае ўздзеянне; д) дакладнасць інфармацыі.

**Заданне 4.** Закончыце фармулёўку: Камбінаторныя прырашчэнні сэнсу слоў найперш уласцівы такому стылю, як ______________

**Заданне 5.** Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, уласцівыя гутарковаму стылю: а) пірог – пальчыкі абліжаш; б) прыняць да ведама; в) слухалі мы слухалі; г) узяў ды і скокнуў; д) неабходна заўважыць, што.

**Заданне 6.** Адзначце афіцыйныя дакументы, у якіх моўныя сродкі ў пэўнай ступені аднолькавыя: а) пасведчанне; б) заява; в) дыплом; г) рэкамендацыя; д) характарыстыка.

**Заданне 7.** Запішыце тэрмін, які часта выкарыстоўваецца пры аналізе мастацкіх і публіцыстычных тэкстаў: ______

**Заданне 8.** Закончыце фармулёўку: Сказ, у якім склад дзейніка малалікі і ўся актыўная інфармацыя сканцэнтравана ў складзе выказніка, характэрны для такога тыпу тэксту, як __________________________

**Заданне 9.** Адзначце асаблівасці апавядання: а) асноўная думка (тэзіс); б) агульная ацэнка; в) завязка; г) розныя часавыя адносіны; д) паслядоўнасць.

**Заданне 10.** Адзначце асаблівасці паралельнай сувязі сказаў: а) лексічная непаўната; б) паралелізм у будове сказаў; в) дзеянні, якія апісваюцца, змяняюцца адначасова; г) анафарычныя строфы; д) парцэляваныя канструкцыі.